Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 99 (4003)
СУБОТА, 11 КРАСАВІКА 1931 г.
Цана нумару 5 кап.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА

Генэральная праверка выклікала прыліў у калгасы

АСІПОВІЧЫ. ЗА ЧАС ГЕНЭРАЛЬНАЙ ПРАВЕРКІ У КАЛГАСЫ РАЁНУ УЛІЛОСЯ 90 НОВЫХ БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК. ГЭТАМУ СПРЫЯЛА ТОЕ, ШТО НА СЕЛЬСАВЕТАХ БЫЛІ ПРАВЕДЗЕНЫ КАНФЭРЭНЦЫІ БЕДНАТЫ, ІНІЦЫЯТЫЎНЫХ ГРУП, НА ЯКІХ БЫЛІ ШЫРОКА АБГАВОРАНІЯ ПАСТАНОВЫ 6-га ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ І 3-га ЗЬЕЗДУ КАЛГАСАЎ. У ВЕРАСТОЎСКІМ СЕЛЬСАВЕЦЕ ПАСЬЛЯ АБГАВАРЭНЬНЯ ПАСТАНОЎ ЗЬЕЗДУ АРГАНІЗАВАЎСЯ НОВЫ КАЛГАС З 16 ГАСПАДАРАК.

МАНКЕВІЧ.

Вёска Бахлаўцы завяршыла суцэльную калектывізацыю

АСЬВЕЯ. У выніку першых дзён генэральнай праверкі і папулярызацыі пастановы 6-га Усесаюзнага зьезду саветаў аб арганізацыі працы на прынцыпах зьдзельнічыны рад сельсаветаў раёну дабіліся росту калгаснага прыліву.

У калгас «Будзённы» улілося новых 36 гаспадарак. Такім чынам, завяршылася суцэльная калектывізацыя в. Бахлаўцы. 85 бядняцка-сераднякіх гаспадарак уступіла ў калгас «Тава». У гэты-ж калектыў далкам улілося пасёлак «Уфхой».

Адзначаецца прыліў і ў калгасы іншых сельсаветаў. Усе вярбовачныя брыгады за першыя дні праверкі завербавалі ў калгасы 50 новых членаў.

Бугроў.

10-ты ДЗЕНЬ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ПРАВЕРКІ

НОРМА ВЫПРАЦОЎКІ, АЦЭНЕНАЯ У ПРАЦАДНЁХ, БРЫГАДА І ЛІКВІДАЦЫЯ АБЯЗЬЛІЧКІ—

вось прынцыпы, на якіх грунтуецца правільная арганізацыя зьдзельшчыны

Раённы актыў, настаўніцтва, ізбачы ня прымаюць удзелу ў пераводзе калгасаў на зьдзельшчыну.—У арцелі „Чырвоны пагранічнік" (Заслаўскі раён) пад відам зьдзельшчыны ўвялі падзёншчыну

Калгасы Шклоўшчыны б'юць па кулаку, раўняючыся пры выпрацоўцы норм на сярэднюю выпрацоўку лепшых калгасьнікаў

Менск, 11 красавіка

Пераход на зьдзельшчыну ў саўгасах і калгасах—**важнейшая папітычная задача.** Яе ажыцьцяўленьне **забясьпечыць** перамогу другой бальшавіцкай сяўбы і **выкліча** новую магутную хвалю калгаснага прыліву. Пастановы VI-га ўсесаюзнага зьезду саветаў аб арганізацыі працы ў калгасах на аснове зьдзельнічыны з улікам у працаднёх, выяўляецца бальшавіцкай праграмай барацьбы за далейшае пераможнае разгортваньне калгаснага руху. Зьдзельнічына ў калгасах, як рухавік сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, як багар уздыму працаўцыйнасьці працы і арганізацыйна-гаспадарчага замацаваньня калектыўных гаспадарак, як гігантскі фактар новага калгаснага прыліву, — зьяўляецца мацнейшай зброяй у барацьбе супроць кулацтва і яго памочнікаў — правых і «левых» апартуністаў.

«Без таго,—падкрэсьліў тав. **МОЛАТАЎ** у сваім дакладзе па VI-ым зьезьдзе саветаў,—каб цяпер цесна зьвязаць атрыманьне долі калгаснага прадукту з затрачанай працай і сапраўднай ля прадукцыйнасьцю—**без такой увязкі ў нас ня будзе калгаснага руху.** Без пасьлядоўнага правядзеньня ў жыцьцё гэтага прынцыпу, адзначана з усімі іншымі ўказаньнямі статуту арцелі, наша палітыка калгаснага будаўніцтва будзе на справе не бальшавіцкай, а дробнабуржуазнай, т. зн. на справе акажа дапамогу не савецкай уладзе ў будаўніцтве сацыялізму, а дапамогу кулацтву ў яго барацьбе з калгасамі».

СНК БССР абавязаў усе раённыя і сельскія саветы, Наркамзем, Калгасцэнтр, Трактарацэнтр і Саўгастрэсты **забясьпечыць ажыцьцяўленьне зьдзельшчыны да 15-га красавіка ў кожным** саўгасе і калгасе. Як выконвацца гэта галоўная дырэктыва ўраду, як мы ажыцьцяўлем пастановы VI-га ўсесаюзнага зьезду саветаў аб зьдзельшчыне?

Матар'ялы, якія публікуюцца сёньня ў **«ЗЬВЯЗЬДЗЕ»**, прымушаюць **БІЦЬ ТРЫВОГУ.** Яны сьведчаць аб тым, што масавая растлумачальная работа вакол задач зьдзельшчыны ў раёнах БССР разгорнута **ЗУСІМ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА.** Яны сьведчаць аб тым, што як цэнтральныя, так і мясцовыя арганізацыі, асабліва калгасная сыстэма **СЛАБА, ЗЛАЧЫННА СЛАБА** рэалізуюць пастановы VI-га зьезду саветаў аб пераходзе калгасаў на зьдзельшчыну з улікам у працаднёх. Яны паказваюць, што пераход калгасаў на зьдзельшчыну адбываецца **ГАНЕБНА МАРУДНА.**

Чым як не агідным ігнараваньнем 1 сакавіка дырэктыў партыі і ўраду можна назваць той факт, што ў ільнаводным **Дрысенскім раёне** зьдзельшчыну ўводзяць толькі як... вопыт у... ільнях жывёлагадоўчых камунах. І такія факты не зьдзіўляюць выключэньнем. Раённыя арганізацыі, як правіла, яшчэ не разгарнулі канкрэтнай практычнай работы, каб забясьпечыць пераход калгасаў на зьдзельшчыну. Пастановы VI-га зьезду саветаў аб зьдзельшчыне па абсалютнай большасьці раёнаў сусім не папулярызаваны. Белкалгасцэнтр кіруе пераходам калгасаў на зьдзельшчыну ўсьлепую. Дакладных даных аб тым, як праводзіцца на мясцох рота работа, Калгасцэнтр ня мае. Між тым да 15-га красавіка засталося толькі 4 дні. Толькі гэтымі днямі Калгасцэнтр атрымаў даныя аб праведзеньні зьдзельнічыны толькі па 8 раёнах. Што-ж робяць іншыя 91 раён,—**невядома.**

Налуўныя весткі аб пераходзе на зьдзельшчыну зьяўляюцца больш чым трывожнымі. Па 8 раёнах з 600 калгасаў толькі 145 прынялі нормы выпрацоўкі і ўстанавілі адзенкі ў працаднёх. У цэлым радзе раёнаў яшчэ і да гэтага часу ні адзін калгас не перайшоў на зьдзельнічыну (Вульскі і інш.).

Карэспандэнцыя з **Заслаўскага** раёну, якая зьмяшчаецца сёньня ў «Зьвязьдзе», сыгналізуе аб тым, што пасобныя калгасы, уводзячы зьдзельнічыну, **дапускаюць грубейшыя скрыўленьні ля асноўных прынцыпаў.** У гэтым раёне пасобныя калгасы **падмянілі зьдзельнічыну фактычна падзёншчынай.** Яны не ўстанавілі цьвёрдых норм выпрацоўкі і галоўнае **НЕ АЦАНІЛІ ІХ У ПРАЦАДНЁХ.** У калгасе «Чырвоны пагранічнік», напрыклад, які фармальна перайшоў на зьдзельнічыну, **няма ніякіх норм выпрацоўкі і ўліку якасьці работы. Такім чынам тут пад відам зьдзельшчыны ўвялі самую няпрыкрытую грубую падзёншчыну.**

Гэтыя грубейшыя шкодныя тамылі павінны быць неадкладна выпраўлены. Трэба шырока растлумачыць усім калгасьнікам, што **ЗЬДЗЕЛЬНАЯ РАБОТА ПАВІННА АЦЭНЬВАЦЦА ТОЛЬКІ Ў ПРАЦАДНЁХ.** Трэба неадкладна выпраўляць усякія парушэньні гэтага прынцыпу.

Увесь раённы актыў, уся калгасна-каапэрацыйная сыстэма, усе партыйныя арганізацыі павінны—за што-б там ні стала зьбясьпечыць сваячасовае выкананьне дырэктыў партыі і ўраду аб зьдзельнічыне. Невыкананьне пастановы VI-га зьезду саветаў аб арганізацыі працы ў калгасах на аснове зьдзельнічыны, супрацоўленьне ўкараненьню зьдзельнічыны ў калгасы ёсьць самая шкодная праява правага апартунізму, простая дапамога кулацтву.

Бальшэвікі вядучы барацьбу з кулацкай арганізатарскую работу, дабіваюцца найшырэйшую масавую растлумачальную і арганізатарскую работу, аб'ем'ся найком і апартуністамі, разгортваючы найшырэйшую масавую растлумачальную у кожным саўгасе.

Патрэбны [illegible] парадкам і з правага [illegible] на саўгасах. Сапраўдны [illegible] і ўдарнік [illegible] на [illegible] ня [illegible] ня [illegible] ня

СУДОВАЯ КАМЭДЫЯ У ВАРШАВЕ—

чарговы этап у падрыхтоўцы інтэрвэнцыі супроць СССР

Пракуратура абходзіць моўчкі суддзельнікаў замаху

ВАРШАВА, 9. Пасьля прачытаньня абвінавачэньня акту, суд распытаў заяву **Палянскага**, які, ня гледзячы на неадкараванасьць напамінальні старшыні, **не перастае украдкай чытаць свае паказаньні напісаныя**, апраўдваючыся «слабой памяцьцю».

Падсудны прызнае, што ён устанавіў электрычную праводку і што ён зьмясьціў у кошыке савецкага пасольства **пякельную машыну**. Але ўсё гэта было проблемі нібы ня з мэтай уварыву пасольства, а ў выглядзе «дэманстрацыі» супроць савецкай улады для таго, каб давесьці неабходнасьць барацьбы з бальшавізмам. Ён, Палянскі, «крысьцьянін і не жадае рабіць дранцтва». «Чалавек зьяўляецца зброяй госпада бога»,— разважаў Палянскі, і парашыўшы давесьці «маральную перавагу хрысьцьянства над бальшавізмам», перарэзаў нібы, у некалькіх мясцох электрычныя правады для таго, каб ні ў якім выпадку не адбыўся выбух. Паводле слоў Палянскага, ён ужыў усе меры для таго, каб давесьці бальшавікам, што ён могбы ўзарваць пасольства, але «не хацеў гэтага рабіць». Таму Палянскі палажыў, нібы, такую праводку, што яна магла быць адразу выкрыта і зьнішчана, і сапсаваў электрычны кантакт, які злучаў пякельную машыну з электрычнай праводкай, сканструяваў, нібы, такі ўларнік у бомбе, каб не маглі атрымацца іскры, сабраў, нібы, наўмысьла ня правільна часавы мэханізм і начыніў снарад такой выбухочай матэрыяй, якая ня ў стане была разарваць нават яго абалонку.

З далейшых паказаньняў аказваецца, аднак, што Палянскі паступіў так ня столькі з хрысьціцкіх пабужденьняў, колькі з імкненьня загаляв загатоніць «довады», зьмякчаючыя яго віну, бо ён «прадчуваў», што яму прыдзецца адказваць перад судом.

Ужо пры першых пытаньнях пракурора і членаў суда Палянскі безнадзейна заблытваецца. Палянскі ня можа вытлумачыць, як ён бяз чыёй-б там ні было дапамогі арудаваў на даху, прымацоўваў электрычныя правады, **устанаўляў пякельную машыну.** Да рэчы, **пракурор па гэтым пытаньні не асаблівa нацiскае на падсуднага**, а пытаньне аб існаваньні супольніцкай арганізацыі, якая шасьлала Палянскага на гэту справу, **пакуль ня цікавіць пракурора.**

Пасьля яўнага правалу спроб Палянскага выкруціцца пры расьсьледваньні фактычнага боку справы, Палянскі таксама пяўдала прабуе адыграцца на палітычным. Ён расказвае, што ў СССР яго чакала «бліскучая кар'ера», але гэтай кар'еры перашкодзіла зноў, да рэчы, яго «хрысьціянскасьць»: ён не хацеў, бачыце, есьці савецкі хлеб, не жадаючы прыняць на сябе цяжкі крыж. Палянскі расказвае вялізарнейшую гальматыю аб тым, што нібы савецкая ўлада шукала яго, абвінавачваючы яго ў «арганізацыі замаху ў Маскоўскім Крэмлі» у 1924 годзе. Прычым за яго затрыманьне, нібы, была назначана ўзнагарода ў 10 тыс. рублёў.

Палянскі прабуе потым перайсьці да больш агульных палітычных пытаньняў. «Самым вялікім няшчасьцем для ўсякай дзяржавы зьяўляецца, — таварыць ён,—цярпець у сваім арганізме савецкае прадстаўніцтва». Асканцаліўшыся па палітычным жэзамэне і злоўлены на месцы злачынства ў тым, што ў расьсьледваньні фактычнага боку справы ён **хлусіў**, Палянскі прапуляе выключную нядбайнасьць у часе допыту сьведак.

Першым дапытваецца камісар палітычнай паліцыі **Галчынскі**, потым дворнік суседняга з пасольствам дому **Качынскі**, паліцэйскія: Андруховіч, Скрэшнюўскі, Сохачынскі, шпітэхнік Махай.

Асноўныя моманты допыту сьведак заключаюцца ў высьвятленьні ряду тэхнічных пытаньняў, якія датычаць пабудовы пякельнай машыны, часовага мэханізму і электрычнага провалу. Ад гэтых паказаньняў большасьці сьведак разьлітаюцца ўпчэнт цьвердженьні Палянскага аб яго «хрысьціянстве» і спробе паказаць замах «нізвіннай дэманстрацыяй» супроць бальшавікоў. Усе сьведкі аднадушна сьцьвярджаюць, **што провад нідзе ня быў перарваны.** (ТАСС).

Гаспадарчы развал паглыбляецца

Скарачэньне ліку занятых рабочых, якое праводзяць польскія капіталісты амаль ва ўсіх галінах прамысловасьці, набывае масавы характар.

Тысячы рабочых выкідваюцца на вуліцу бесьпрацьвіцьня, павялічваючы 1 да таго вялізарную армію беспрацоўных.

Орган эндэкаў - фашыстаў «Газэта Варшавска» а 3-га красавіка пад загалоўкам «Чорныя дні ў Верхняй Сілезіі» падае пералік тых скарачэньняў, якія адбыліся ў Верхняй Сілезіі на працягу толькі 2-х апошніх дзён.

У Катавіцах у капальнях імя Пілсудскага зволена **1.002 рабочых**, у капальні «Брада» праведзена скарачэньне **400 рабочых**. З капальнь «Боэр», «Аляксандар I» і «Эмануэль» выкінута на вуліцу **602 рабочых.**

Саюз капіталістаў - уласьнікаў жалезных капалень сарваў калдагавор і абвясьціў **на 7 проц. зьніжэньне зарплаты.** У зьвязку з гэтым адбыліся масавыя мітынгі рабочых. У капальнях «Елена» і «Бжозовіца» мітынг рабочых у ліку 1.500 рабочых пастанавіў рыхтавацца да забастоўкі.

Масавыя скарачэньні закранулі таксама працаўнікоў разьмовай працы.

Так, дырэкцыі капальень князя Пшчынскага, «Катавіцкае акцыянэрнае таварыства», акцыянэрнае таварыства «Верхняй Сілезіі», прадпрыемствы князя Донэрсмарка і шмат іншых звольнілі з работы 800 служачых.

Працэс Палянскага —інсцэніроўка польскага генштабу

БЭРЛІН, 8. У сувязі з працэсам **Палянскага** правая **«Крэйцэйтунг»** указвае, што калі ўспомніць факты сказаньня сапраўднасьці Польшчай у сувязі з актамі тэрору ў Верхняй Сілезіі ў часе перавыбарчай кампаніі, калі ўспомніць інсцэніраваны «замах на Пілсудскага», дык лёгка пераканацца, що **працэс Палянскага зьяўляецца камэдыяй.**

У Польшчы, бясспрэчна, ёсьць органы, якія **сыстэматычна праваноюць катастрофы** і якія, пасьля таго як першыя спробы гэтай правакацыі правaліліся, прабуюць замаскаваць усю гэту справу.

Акрамя таго, падкрэсьлівае газэта, трэба ўлічваць, што фактычна кіруючым органам у Польшчы зьяўляецца не міністэрства юстыцыі і не міністэрства Замежных Спраў, а другі аддзел генэральнага штабу, які трэба разглядаць, як **фактычны ўрад Польшчы.**

«Бэрлінэр Бэрзэнцэйтунг» прысьвячае працэсу Палянскага перадавую, у якой указвае, што ня толькі выкліканы справай Палянскага абмен нотамі паміж СССР і Польшчай, але і галоўным чынам дзіўныя паводзіны польскіх улад надаюць гэтаму працэсу значэньне, якое далёка выходзіць па-за рамкі судовай справы.

Спачатку польская паліцыя спрабавала ўсіляк абарнуць гэту справу ў глупства і паказаць пякельную машыну, якая нібыта была ўзарваць усё савецкае пасольства, у выглядзе нявіннай забаўкі. Газэта падкрэсьлівае «дзіўнасьць» тэй акалічнасьці, што **Палянскі, зрыштаваны ў свой час у Польшчы, быццам як бальшавіцкі шпіён, хутка пасьля гэтага быў ня толькі вызвалены, але і атрымаў польскае грамадзянства.**

«Аднак,—піша далей газэта — **на гэтым не канчаецца рад дзіўнасьцяй:** калі нельга было вытлумачыць ужо тую акалічнасьць, як мог Палянскі на вачох польскай тайнай паліцыі, якая пастаянна ахоўвала пасольства, праводзіць складаную падрыхтоўку да замаху, дык паводзіны Польшчы становяцца яшчэ больш падазронымі, калі аказалася, што арыштаваны Палянскі быў аддан крымінальнаму суду не як «злоумышленник», а як «парушыцель парадку». Абвінавачэньне таксама мае ў сабе рад «няясьнасьцяй».

Атрымліваецца ўражаньне, што ў Варшаве рыхтуецца зноў адна з тых палітычных судовых камэдый, якія даволі часта даводзіліся наглядаць у Верхняй Сілезіі й Памаранні. Здаецца, што і ў даным выпадку прабуюць пры дапамозе судовага працэсу ўтаіць рэчы, да якіх мацюць дачыненьне ня столькі падсудныя, колькі афіцыйныя польскія органы, якія, відавочна, імкнуцца справаваць катастрофу і ператварыць у справу вядомых вайўнічых плянаў Польшчы». (ТАСС).

Гаспадарчы развал паглыбляецца

Скарачэньне ліку занятых рабочых, якое праводзяць польскія капіталісты амаль ва ўсіх галінах прамысловасьці, набывае масавы характар.

Тысячы рабочых выкідваюцца на вуліцу бесьпрацьвіцьня, павялічваючы 1 да таго вялізарную армію беспрацоўных.

Орган эндэкаў - фашыстаў «Газэта Варшавска» а 3-га красавіка пад загалоўкам «Чорныя дні ў Верхняй Сілезіі» падае пералік тых скарачэньняў, якія адбыліся ў Верхняй Сілезіі на працягу толькі 2-х апошніх дзён.

У Катавіцах у капальнях імя Пшчынскага зволена **1.002 рабочых**, у капальні «Брада» праведзена скарачэньне **400 рабочых**. З капальнь «Боэр», «Аляк-

Хваля гневу і абурэньня нарастае

Пралетарыят Менску ўзьнімае голас пратэсту супроць разгулу белага тэрору ў Зах. Беларусі і Зах. Украіне

Супроць пагромаў нацыянальна-вызваленчага руху ў Зах. Беларусі і Зах. Украіне

Пратэст навуковых работнікаў Мэд'інстытуту

Агульны сход навуковых работнікаў мэдычнага інстытуту, заслухаўшы інфармацыю аб крывавых расправах польскай дэфэнзывы над працоўнымі масамі Зах. Беларусі і Зах. Украіны, адзначае:

Пасьпяховае выкананьне няцігавога шляху сацыялістычнага будаўніцтва і ліквідацыі кулацтва як класы на базе суцэльнай калектывізацыі выклікаюць шалёны гнеў з боку ўсіх ворагаў рабочай класы, пачынаючы з самых заядлых капіталістаў і канчаючы іх агентамі — нацыянал-фашыстамі і сацыял-фашыстамі, якія задаліся мэтай зрыву пяцігодкі і падрыхтоўкі ўзброенага нападу на СССР.

Апошнія падзеі ў буржуазнай Польшчы, разгул белага тэрору, замураваньне ў турмах лепшых эмігрантаў за пралетарскую рэвалюцыю, правакацыйны арышт Б. Тарашкевіча з усёй выразнасьцю сьведчаць, што фашысцкая Польшча, дзе эканамічны крызіс асабліва востра адчуваецца, зьяўляецца авангардам сусьветнага імпэрыялізму, займае першае месца ў падрыхтоўцы вайны супроць краіны, у якой будуецца сацыялізм і, як адным з важнейшых момантаў гэтай падрыхтоўкі, зьяўляецца нападзеньне ў крыві нацыянальна-вызваленчага руху ў Зах. Беларусі і Зах. Украіне.

Навуковыя працаўнікі мэдычнага інстытуту ўзьнімаюць свой голас пратэсту супроць фашысцкіх зьдзекаў і катаваньняў над працоўнымі масамі Польшчы, супроць пагромаў нацыянальна-рэвалюцыйнага руху і зьнішчэньня культурна-асьветных устаноў Зах. Беларусі і Зах. Украіны і заклікаюць усе працоўныя масы Зах. Беларусі і Зах. Украіны яшчэ шчыльней згуртавацца вакол камуністычнай партыі Польшчы для ўзмацненьня барацьбы супроць фашысцкай дыктатуры, супроць нацыянал-фашыстаў, супроць падрыхтоўкі ўзброенага нападу на СССР, за ўстанаўленьне дыктатуры пралетарыяту, за савецкую Польшчу.

Навуковыя работнікі са свайго боку абяцаюць прыкладзіць усе свае веды і сілы на дапамогу выкананьня і перавыкананьня трацяга рашаючага году пяцігодкі, які павінен завяршыць фундамант сацыялістычнай будоўлі, на выкананьні свайго акадэмічнага пляну і лепшай падрыхтоўкі кадраў, разгарнуць шырэй мэтады працы па сацспаборніцтве і ўдарніцтве, даць лепшыя прыклады работы, перабудаваць свае выкладаньне, каб яно спрыяла клясава - палітычнаму выхаваньню студэнцтва, узмацніць работу МОПР'у і інтэрнацыянальнае выхаваньне, узмацніць работу Асавіяхіму і рыхтавацца даць рашучы адпор усім тым, хто адважыцца перашкодзіць нам у нашай працы, хто адважыцца пасягнуць на завалваньні Кастрычніка.

Няхай жыве камуністычная партыя Польшчы!

Няхай жыве УсеКП(б) — авангард сусьветнага пралетарыяту!

Няхай жыве перамога сусьветнага сацыялізму!

У адказ фашысцкім катам—узмацнім дапамогу палоненым капіталу

Заслухаўшы інфармацыю старшыні РК МОПР'у аб тэроры, які панує на акупаваных фашызмам **Заходняй Беларусі і Зах. Украіне, агульны сход саюзу друкароў канстатуе:** польскі фашызм, які задыхаецца ў пісках эканамічнага і палітычнага крызісу, шукае выхаду ва ўзброенай інтэрвэнцыі супроць СССР.

Але магутны рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух, які штодня ўсё больш і больш узмацняецца, адсоўвае тэрміны ажыцьцяўленьня злачынных плянаў фашысцкіх інтэрвэнтаў.

Разгром ТВШ і Беларускага работніцка-сялянскага клюбу «Змаганьне», разгром ППС-лявіцы, драконавыя шматгадовыя прысуды над паслямі «Змаганьня», арышт тав. Тарашкевіча, а таксама крывавыя катаваньні і забойствы ў Горадзенскай, Кобрынскай і Слонімскай астрагах лепшых прадстаўнікоў пралетарыяту і працоўнага сялянства гавораць аб тым, што польскі фашызм шпаркімі тэмпамі рыхтуе тылы для антысавецкай вайны.

У адказ на нябачаны тэрор польска-фашысцкіх катаў, сход саюзу друкароў пастанаўляе: аддаць усе сілы на выкананьне трамфінпляну трацяга рашаючага году пяцігодкі, на ўзмацненьне абароназдольнасьці пралетарскай краіны.

Адначасова сход абяцае з яшчэ большай актыўнасьцю арганізаваць зборы па дапамозе палітзьняволеным фашысцкіх турмаў.

Палітзьнятаў выганяюць

ВІЛЬНЯ, 9-га красавіка. У вёсны Вышкі, Бельскага раёну, сяляне вычалі з вёскі сэквэстратара і палітзьнята, якія прышлі адбіраць за ядоімкі сялянскае дабро.

Упартая барацьба сялян

ВІЛЬНЯ, 9-га красавіка. У адной з вёсак Бераставіцкага раёну, Беластоцкага ваяводзтва, барацьба сялян, у сувязі з ліквідацыяй сэрвітутаў, прадпрымаецца з посьпехам ужо каля 5 год. Надаўна была новая спроба з боку акупантаў прымусіць сялян пайсьці на ліквідацыю сэрвітутаў. Сабраўшыся на сход, сяляне пастанавілі даць адпор акупантам. Калі прыехаў абшарнік і паліцыя, сяляне дубінамі вычалі іх з вёскі.

5 новых паветаў у руках Чырвонай арміі

ШАНХАЙ. Чырвоныя войска, адбіўшы атакі урадавых войск у правінцыі ЦЗЯНСІ, перайшлі ў наступленьне і ЗАНЯЛІ 5 НОВЫХ ПАВЕТАЎ. Сярод вышэйшага камандзнага складу ўрадавых войск панує замяшанасьць у сувязі з такімі буйнымі посьпехамі чырвоных і ў сувязі з масавым пераходам салдат з урадавых вайсковых часьцей у Чырвоную армію.

Сёньня, 11-га красавіка ў 7 гадзін. вечара ў памяшканьні Гаркому КП(б)Б адбудзецца нарада сакратароў парт'ячэек і радкалегій насьцен-газэт і шматтыражак, па пытаньні правядзеньня масавічнія агітаду візавога друку і сарэвэалічна-перавыбарчай кампаніі радкалегій насьцэнгазэт і шматтыражак.

Явка ў парадку партдысцыпліны абавязкова.

Горшыя часы царызму бляднеюць перад нячуваным тэрорам польскай паліцэйшчыны

Разгул новай хвалі крывавага тэрору польскага фашызму супроць усяго рэвалюцыйна - вызваленчага руху Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны набыў нячувана зьверскія формы.

Луцк, Ліда, Кобрын, Берасьце—вось імёны, ад аднаго ўспаміну якіх кроў ледзянее ў жылах.

РАЗГРОМ БЕЛАРУСКАГА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАГА КЛЮБУ «ЗМАГАНЬНЕ», РАГРОМ ТБШ, КААПЭРАЦЫЙНАГА БАНКУ Ў ВІЛЬНІ, ШМАТГАДОВЫЯ КАТАРЖНЫЯ ПРЫСУДЫ НАД КІРАЎНІКАМІ «ЗМАГАНЬНЯ», РАЗГРОМ ППС-ЛЯВІЦЫ І АРЫШТ УСІХ УДЗЕЛЬНІКАЎ ЗЬЕЗДУ Ў ЛОДЗІ, ПРАВАКАЦЫЙНЫ АРЫШТ Б. ТАРАШКЕВІЧА — УВЕСЬ ГЭТЫ ЛАНЦУГ ПОДЛЫХ ФАШЫСЦКІХ ВЫПАДАЎ СУПРОЦЬ ПРАЦОЎНЫХ МАС ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ І УКРАІНЫ НЯ МОЖА НЯ ВЫКЛІКАЦЬ ГЛЫБОКАГА ПРАЛЕТАРСКАГА АБУРЭНЬНЯ З БОКУ УСЯГО СУСЬВЕТНАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ.

Польскі фашызм, загнаўшы краіну ў гаспадарчы тупік, павялічыўшы армію беспрацоўных і паміраючых ад голаду ў сяле ў Польшчы, шукае выхаду з крызісу ў вайне супроць Савецкага Саюзу.

Для задушэньня ўсяго рэвалюцыйнага руху, польскі фашызм кідае ўсіх лепшых сыноў працоўных у турмы.

13 ТЫСЯЧ ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫХ У ПОЛЬШЧЫ — ГЭТА НЯЧУВАНАЯ ЛІЧБА НАВАТ ДЛЯ ГОРШЫХ ЧАСОЎ РАСІЙСКАГА ЦАРЫЗМУ.

Усім гэтым польскі царызм хоча стварыць для сябе выгоднымі ўмовы для нападу на Савецкі Саюз.

МЫ, РАБОЧЫЯ, РАБОТНІЦЫ І ІНЖЫНЭРНА - ТЭХНІЧНЫ ПЭРСАНАЛ ЧЫРВОНАСЬЦЯЖНАГА СКУРЗАВОДУ «БАЛЬШАВІК», УЗЬНІМАЕМ СВОЙ ГОЛАС ПРАТЭСТУ СУПРОЦЬ АЗЬВЯРЭЛАЙ РАСПРАВЫ ПОЛЬСКАГА ФАШЫЗМУ І ЗАЯЎЛЯЕМ, ШТО ЎЗМАЦНЕНЬНЕМ СВАЕЙ ШТОДЗЕННАЙ БАРАЦЬБЫ ЗА ВЫКАНАЎНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ МЫ БУДЗЕМ УЗМАЦНЯЦЬ СССР, БАЦЬКАЎШЧЫНУ СУСЬВЕТНАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ.

МЫ АБАВЯЗУЕМСЯ БАРАЦЬБОЙ СУПРОЦЬ БРАКУ, ПРАГУЛАЎ, БАРАЦЬБОЙ ЗА ПАВЫШЭНЬНЕ НОРМ І ЗЬНІЖЭНЬНЕ РАСЦЭНАК — ЗАБЯСЬПЕЧЫМ КАНЧАТКОВУЮ ПАБУДОВУ ФУНДАМАНТУ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЭКАНОМІКІ СССР УЖО Ў БЯГУЧЫМ ГОДЗЕ.

Мы запэўняем польскі пралетарыят і пралетараў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, што ў іх клясавай барацьбе супроць загнаёючага польскага фашызму мы атрымаюць поўнае спачуваньне і пралетарскую дапамогу з нашага боку.

Узмацненьнем радоў МОПР'у ўзмоцнім матар'яльную дапамогу палітзьняволеным капіталістычных краін.

Далоў польскі фашызм!

Няхай жыве сусьветная рэвалюцыя!

За генэральную лінію партыі!

Няхай жыве пенінскі ЦК УсеКП(б)!

Няхай жыве правадыр нашай партыі —тав. Сталін!

БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ

ВЫРАШАЮЦЬ ПОСЬПЕХІ БАЯВОЙ ПАДРЫХТОЎКІ РСЧА

Партыйная арганізацыя беларускай чырвонасьцяжнай дывізіі бальшавіцкі згуртаваной і ідэалёгічна ўстойлівай прышла да сваёй XXI дывізійнай партканфэрэнцыі

У змаганьні за ўдарную дывізію

Мінулы год быў годам упартай работы, высокіх тэмпаў, бальшавіцкага змаганьня партарганізацыі дывізіі за выкананьне і перавыкананьне плянаў баявой падрыхтоўкі — ЗА ЎДАРНУЮ ДЫВІЗІЮ. З вялікімі дасягненьнямі ў рабоце, ідэалёгічна ўстойлівай прыходзіць партарганізацыя дывізіі да сваёй 21-шай партыйнай канфэрэнцыі.

За 13 месяцаў партарганізацыя ўзрасла на 468 чал., з якіх 65,5 проц. рабочых. Партыйная праслойка ў дывізіі складае 17,1 проц., камсамольская — 28,3 проц. Камсамол зьяўляецца сапраўдным памочнікам партарганізацыі ў барацьбе за тэмпы і якасьць баявой вучобы. Сярод начальніцкага складу дывізіі 65 проц. камуністаў. Нізавое звяно ў сыстэме адзіначальня — камандзіры рот і батарэй — амаль на 100 проц. АДЗІНАНАЧАЛЬНІКІ.

Маладшы камандны склад і чырвонаармейская маса, сярод якіх значнае ядро рабочых і калгаснікаў, моцна згуртаваны вакол партыйнай арганізацыі. УСЕ ВАЙСКОВЫЯ ЗЛУЧЭНЬНІ ДЫВІЗІІ УДАРНЫЯ. Індывідуальным ударніцтвам у кожным падразьдзяленьні партыйцы і камсамольцы ахоплены на 100 проц., начальніцкі склад — ад 60 да 100 проц., чырвонаармейскі — ад 55 да 95 проц. ВОСЬ АСНОЎНЫЯ І РАШАЮЧЫЯ ЎМОВЫ, ЯКІЯ ЗАБЯСЬПЕЧВАЮЦЬ ВЫКАНАНЬНЕ ВЫСУНУТАГА ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЙ МАСАЙ ЛЕЗУНГУ — «ДА 1 МАЯ ГЭТАГА ГОДУ ДАБІЦЦА ЗВАНЬНЯ ЎДАРНАЙ ДЫВІЗІІ».

Значныя дасягненьні набыла наша дывізія і ў стралковай справе. Пытаньні аўладаньня тэхнікай, зьбережэньня зброі вырашаюцца, як галоўнейшыя пытаньні. Рацыяналізатарская работа пачынае ўсё глыбей і глыбей прасякаць у масы, суцаваюцца адзіай з рашаючых умоў нашай барацьбы за баявыя тэмпы вучобы. Толькі за апошнія 2 з паловай месяцы было сабрана 1.260 прапаноў, з якіх 65 проц. ужо рэалізавана. Ёсьць вынахідзтвы і ўдасканаленьні.

Партыйная арганізацыя і начальніцкі склад правялі вялікую работу ў справе беларусізацыі, як адзнай з частак нацыянальнай палітыкі партыі. Беларуская мова добра замацоўваецца ва ўсёй нашай рабоце. З адзінкамі, якія не разумеюць усёй палітычнай важнасьці аўладаньня беларускай мовай, на якой гаворыць чырвонаармейская маса, якія супраціўляюцца правядзеньню беларусізацыі, партыйная арганізацыя вядзе рашучую барацьбу, як з носьбітамі шавінізму.

Рашуча пераключана ўвага партыйнай арганізацыі і камандна-палітычнага складу да камандзірскай вучобы. Створан пералом сярод начскладу да пытаньняў павышэньня тэарэтычнай вучобы. Начальніцкі склад настойліва ПРАЦУЕ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ ДЫРЭКТЫЎ РВС СССР па пытаньнях вучобы камандзіраў.

Ваенкораўскі рух, нізавы друк, усе формы масавага ўзьдзеяньня на прывядзены ў рух вакол аднаго стрыжнёвага пытаньня — баявой падрыхтоўкі. Усе палкі дывізіі маюць друкаваныя шматтыражкі. Вось дадатковыя фактары, якія гарантуюць пасьпяховасьць у вырашэньні задачы, каб наша дывізія была ўзорнай дывізіяй.

Бязумоўна, што ўсе гэтыя посьпехі не азначаюць, што ў нашай барацьбе за ўдарную дывізію мы ўсе задачы вырашым цалкам і поўнасьцю. На куставых сходах па дакладзе палітычнага аддзелу партыйнай масы дывізіі самакрытычным аналізам завастрыў рад пытаньняў, якія яшчэ ня вырашаны. Адно з асноўных пытаньняў — гэта тое, што нашу перабудову работы трэба давесьці да канца. Рота, батарэя яшчэ патрабуюць значнай увагі і дапамогі. Асноўныя задачы перабудовы, як канкрэтнае кіраўніцтва, штодзенная дапамога і паказ, яшчэ невыстарчальна прасякнуты ў штодзенную практычную работу.

Лёзунг — да 1 мая дывізія павінна быць ударнай — ва што-б там ні стала павінен быць выкананы. На выкананьне гэтай задачы партканфэрэнцыя яшчэ больш мабілізуе партыйную арганізацыю, чырвонаармейскі і начальніцкі склад. Трэба баявымі бальшавіцкімі тэмпамі зьнішчыць недахопы, якія ляжаць на шляху ўдарнай дывізіі. Асноўныя задачы ў змаганьні за ўдарную дывізію намі вырашаны. Іх трэба давесьці да канца.

Ў—наў.

Няўхільна ажыцьцяўляем ленінскую нацпалітыку партыі

Беларуская чырвонасьцяжная дывізія побач з радам дасягненьняў у баявой падрыхтоўцы пабыла вялікія посьпехі ў практычным ажыцьцяўленьні нацыянальнай палітыкі партыі.

Сярод шырокіх мас вайсковаслужачых дывізіі прапрацаваны пастановы XVI зьезду УсеКП(б) па нацыянальным пытаньні. Глыбокі адбітак у практычнай рабоце партарганізацыі часьцей дывізіі знайшлі пастановы кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б. Праведзены месячнік беларусізацыі ўнёс яшчэ большы зрух у бок паглыбленай прапрацоўкі і практычнага ажыцьцяўленьня прынцыпаў ленінскай нацыянальнай палітыкі. На сёньняшні дзень у асноўным уся вайсковая, палітычная, масавая работа ў дывізіі праводзіцца на беларускай мове. У беларускай літаратуры і падручніках (статуты) дывізія ўжо не адчувае таго недахвату, што адчувала раней.

Вялікія дасягнуты посьпехі і ў галіне карэнізацыі каманднага складу. Калі ў 1927 годзе сярод камандзнага складу дывізіі мы мелі камандзіраў— беларусаў 47,3 проц., дык зараз гэты процант павялічваецца да 62,5.

У барацьбе за ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі партыйная арганізацыя дывізіі галоўны агонь накіроўвала супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе. Вялікадзяржаўна-шавіністычныя элементы выступалі супроць беларусізацыі. Асобы камандзнага складу—**Юшкевіч, Шахноў** (5-ты полк), **Шаўліс** (4-ты полк) у сваіх выступленьнях супроць беларусізацыі скочваліся на погляды яўных вялікадзяржаўных шавіністаў. Апрача адкрытых вылазак вялікадзяржаўных шавіністаў, мы мелі рад выпадкаў пасьўнага супраціўленьня беларусізацыі. Напрыклад, **Сарокін** (артполк), **Гаўрылаў** (6-ты стралковы полк), **Міхайлаў** (сапрота), **Крутаў** (4-ты полк), знаходзячыся некалькі год у беларускай дывізіі, ніякіх захадаў ня ўжывалі для аўладаньня беларускай мовай.

Партыйная арганізацыя дывізіі мабілізавала ўсю чырвонаармейскую масу і начальніцкі склад на бязьлітасную барацьбу з контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам. У сувязі з выкрытай групай контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратычных элемэнтаў ва ўсіх часьцях дывізіі на мітынгах выносіліся патрабаваньні сурова пакараць агентаў польскага фашызму—беларускіх контр-рэвалюцыйных нацдэмаў. У выніку праведзенай шырокай раслумачальнай работы аб сутнасьці беларускага нацыянал-дэмакратызму мы ня маем ніводнага выпадку прымірэнчых адносін да яго. Таксама партарганізацыя рашуча рэагавала на вылазкі яўрэйскага шавінізму і інш., якія праяўляліся ў паасобных выпадках.

Падагульваючы вынікі ўсёй работы, канфэрэнцыя яшчэ больш мабілізуе партыйную арганізацыю на павялічэньне тэмпаў у рабоце па правядзеньні беларусізацыі, на яшчэ больш узмоцненую барацьбу з праяўленьнямі розных ухілаў ад ленінскай нацыянальнай палітыкі, скацэнтроўваючы галоўны ўдар на вялікадзяржаўным шавінізьме, як галоўнай небясьпецы на даным этапе.

П. С.

Тварам да задач баявой падрыхтоўкі

Дывізійная партыйная камісія сваю штодзенную работу падпарадкавала задачам згуртаванасьці партыйнай арганізацыі дывізіі вакол выкананьня пастановаў партыі, узмацненьня ідэалёгічнай вытрыманасьці, вядучы рашучую барацьбу з правым апартунізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, рэцыдывамі трацкізму і прымірэнцтвам да ўхілаў ад генэральнай лініі партыі.

Партыйная арганізацыя дывізіі падыходзіць да XXXI партыйнай канфэрэнцыі ідэалёгічна ўстойлівай і маральна вытрыманай.

Аднак, у паасобных зьвеньнях партыйнай арганізацыі, часамі трыцілася бальшавіцкая пільнасьць. Напрыклад, **ячэйка менскага ваенкамату**, ня гледзячы на сваячасовыя сыгналы з боку «Чырвонаармейскай праўды» і паасобных камсамольцаў, на трацкісцкую контр - рэвалюцыйную вылазку ў ваенкамаце па прамяру 2-х тыдняў не рэагавала.

У часе разгортваньня работы сярод падлягаючых чырвонаармейцаў звальненьню ў бясстэрміновы водпуск, частка партыйцаў у колькасьці 12 чал., якія скончылі курсы калгаснікаў - арганізатараў, праявілі правы апартунізм на практыцы. Пяць чал. за гэта выключаны з партыі, іншыя прынялі свае памылкі і зараз працуюць у калгасах.

Незадавальні разгортваньня зімовай вучобы з боку камісара сапёрнай роты тав. Рягачова была праўлена апартуністычная стаўка на самацёк у пытаньнях мабілізацыі партыйнай і камсамольскай арганізацый па выкананьне і перавыкананьне плану баявой падрыхтоўкі.

З боку паасобных партыйцаў мела месца недадзенка разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі, а ў некаторых выпадках былі моманты простага заціску самакрытыкі. На зьмешчанную заметку ў «Чырвонаармейскай праўдзе», якая сыгналізавала прарывы ў конным разьдзеле 5-га палка, камандзір разьдзелу, замест таго, каб прыняць рашучыя меры для ліквідацыі прарываў, заявіў: **«Я больш у казарму ня пушчу гэтага ваенкора** таму, што ён піша, каб зарабіць грошы на гэтым». Характэрна, што прысутны пры гэтым нам. рэдактара шматтыражкі партыец, ня толькі не палічыў патрэбным паказаць на няправільнае і шкоднае тлумачэньне заметкі, а сам пачаў падтакваць разважаньням зажымшчыка самакрытыкі. Другі, ня менш абураючы выпадак, быў у менскім ваенкамаце, калі ячэйка распусьціла рэдакцыйную калегію насьценнай газэты за тое, што ў гэтай газэце па-бальшавіцку крытыкаваліся недахопы ў рабоце.

ДПК пры дапамозе ўсёй партыйнай арганізацыі дывізіі вяла рашучую барацьбу з зажымшчыкамі самакрытыкі і з усімі тымі, хто ў той ці іншай меры аслабляў баявую гатоўнасьць часьці. Толькі за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў, за нядбайнасьць у рабоце на баявой падрыхтоўцы 26 чал. прыцягнуты да партыйнай адказнасьці.

За мінулы год разам з ростам палітычнай актыўнасьці чырвонаармейскага і начальніцкага складу значна ўзрасла партыйная арганізацыя. Рост партарганізацыі ішоў, галоўным чынам, за лік рабочых і калгаснікаў—лепшых ударнікаў на баявой падрыхтоўцы.

Трэба адзначыць што работа з прынятымі ў партыю праводзіцца ў радзе ячэек невыстарчальна. З боку некаторых ячэек няма належнай увагі і падыходу да кожнага кандыдата партыі ў паасобку, выходячы з яго палітычнага ўзроўню. З гэтай прычыны частка кандыдатаў перарасла даўно свой стаж, а для пераводу ў партыю не падрыхтавана.

ДПК правяла значную работу на ідэалёгічным узмацненьні дывізійнай арганізацыі ЛКСМБ. Камсамольская арганізацыя зьяўляецца сапраўдным памочнікам партыйнай арганізацыі ў баявой падрыхтоўцы.

Задачы максымальнай садзейнасьці камандаваньню і палітычнаму апарату ў выкананьні плянаў баявой падрыхтоўкі займалі шырокае месца ў рабоце ДПК. Члены ДПК прымалі актыўны ўдзел у камісіях на абсьледваньні становішча баявой падрыхтоўкі і правядзеньня работы на зьніччэньні недахопаў. ДПК рашуча рэагавала на праяўленьні правааапартуністычнай стаўкі на самацёк у рабоце. ДПК разам з партыйнай арганізацыяй дасягнула карэннай перабудовы работы па забесьпячэньні баявой падрыхтоўкі. Важнейшая задачай у далейшым зьяўляецца ўзмацненьне дапамогі ў рабоце нізавых выгеньняў партарганізацыі па выкананьні ўсіх задач, якія стаць перад дывізійнай партарганізацыяй.

КАЛАБАЕЎ.

Да праверкі рэалізацыі вывадаў праверкомаў

ЦКК КП(б)В прыступіла да праверкі выкананьня ячэйкамі і райкомамі пастаноў, прынятых у часе генэральнай праверкі і чысткі радоў КП(б)Б. Гэта праверка ўскладаецца на мясцовыя кантрольныя камісіі і райкомы КП(б)Б. Праверка гэтых дырэктыў павінна пайсьці па лініі выяўленьня таго, які ўплыў мела праверка і чыстка радоў партыі на паляпшэньне складу і работы партыйных арганізацый, па колькі тая ці іншая парт'ячэйка сапраўды згуртавана і мабілізавана на выкананьне задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Галоўную ўвагу пры праверцы неабходна зьвярнуць на яшчэ большае узмацненьне бальшавіцкага адзінства радоў партыі і на тое, як нізавыя зьвяны партарганізацыі вядуць барацьбу з канкрэтнымі посьбітамі ўхілаў ад генэральнай лініі партыі.

Праверка і чыстка партыі ўзьняла баяздольнасьць партыйных арганізацый у змаганьні за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, ачысьціла яе ралы ад чужых, яўнаапартуністычных элемэнтаў і

Пераключыцца на практычнае ажыццяўленьне ўзятых абавязкаў

На прадпрыемствах БССР у адказ тульскім рабочым узьнялася новая хваля ўдарнага руху і добраахвотнага павышэньня норм выпрацоўкі, яшчэ больш узмацняецца большавіцкая барацьба за выкананьне плянаў трэцяга рашаючага

Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі павінны ўвязаць падрыхтоўку да другой гадавіны сацыялістычнага спаборніцтва з рэалізацыяй адозвы рабочых тульскага заводу № 1

Разгарнуць падрыхтоўку

да 2-ой гадавіны сацыялістычнага спаборніцтва

Праз 17 дзён спаўняецца другая гадавіна сацыялістычнага спаборніцтва.

Працяглыя 2 гады поўны вялізарных перамог на ўсіх фронтах сацыялістычнага будаўніцтва. Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, праз сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва пралетарыят перакуліў усе прадраканьні клясавых ворагаў і анархістаў аб непасільнасьці узятых тэмпаў. Лёзунг «Пяцігодка—за чатыры гады» парадзіўся ў выніку ўзросшай актыўнасьці пралетарыяту, у шырокай хвалі сацыялістычнага спаборніцтва.

Метадам спаборніцтва пралетарыят змагаецца за выкананьне плянаў сацыялістычнага будаўніцтва, за пабудову ў гэтым годзе 518 новых заводаў і фабрык і 1040 машына-трактарных станцый.

Перадавыя атрады пралетарыяту—бакінскія, грозьненскія нафтавікі напярэдадні другой гадавіны сацыялістычнага спаборніцтва выканалі пяцігадовы плян за 2½ гады. Рабочыя тульскага заводу № 1, якія выканалі значна павялічаную ў параўнаньні з мінулым годам праграму першага кварталу, зьвярнуліся да ўсіх рабочых і калгасьнікаў СССР з заклікам яшчэ больш намагчы сілы на выкананьне і перавыкананьне плянаў, на большавіцкую сустрэчу другой гадавіны сацыялістычнага спаборніцтва.

Каб выканаць пляны трэцяга рашаючага году пяцігодкі патрэбна мабілізацыя сіл усіх рабочых заводаў і фабрык, калгасаў і саўгасаў. Таму заклік рабочых тульскага заводу № 1 сустрэў жывы і гарачы водгук у пралетараў Савецкай Беларусі. Адзін за адным уключаюцца заводы і фабрыкі ў масавы паход за ўмацненьне і пашырэньне сацыялістычных форм працы, за перагляд норм выпрацоўкі. Заклік цалкам прыняты. Рад заводаў і фабрык уносіць і дадатковыя прапановы, канкрэтызуюць іх, бяруць на сябе рад канкрэтных абавязкаў. Рабочыя заводу імя **Варашылава** пазнячылі праграму выпрацоўкі варштатаў. Рабочыя гомельскага заводу **«Пралетары»** абвясьцілі дадатковую падпіску на назыку «Пяцігодка—за чатыры гады». Усе заводы і фабрыкі ў сваіх водгуках абавязуюцца выканаць і перавыканаць прамфінплян па кольласных і па якасных паказальніках, давесьці норму выпрацоўкі да ўзроўню тэхнічнага абсталяваньня і сацыялістычнай рацыяналізацыі, якая праведзена за апошнія гады.

Задача партыйных і прафсаюзных арганізацый пераключыць усю работу па рэалізацыю тых канкрэтных прапаноў і абавязкаў, якія ўзяты на сябе ў выніку прапрацоўкі адозвы тульскіх рабочых. Трэба адразу стаць на чале ўзьнятай новай хвалі творчага энтузіязму рабочых мас. Трэба накіраваць усю ўвагу, усе сродкі на поўнае ажыццяўленьне да другой гадавіны сацыялістычнага спаборніцтва рэзалюцый агульных сходаў рабочых. Асобныя прафсаюзныя арганізацыі яшчэ не ўсьвядомілі ўсёй важнасьці гэтай кампаніі. ЦП саюзу сельгаспрацоўнікаў і саюзу будаўнікоў яшчэ ніякіх мер не прынялі для падрыхтоўкі да другой гадавіны сацыялістычнага спаборніцтва.

Задача заключаецца ў тым, каб адозву тульскіх рабочых зрабіць тым палітычным дакумантам, вакол якога павінна быць разгорнута шырокая масавая работа па мабілізацыі рабочых мас на большавіцкую сустрэчу другой гадавіны сацыялістычнага спаборніцтва, на далейшае разгортваньне ўдарніцтва, на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, на перагляд норм выпрацоўкі.

Тыя матар'ялы, якія друкуюцца сёньня, паказваць, што рабочыя менскіх заводаў не абмежаваліся толькі рэзалюцыямі, а зараз-жа перайшлі да разгорнутага ажыццяўленьня іх у штодзённай рабоце.

Рост ударных брыгад, сустрэчных нормы — вось канкрэтны адказ на адозву тульскіх рабочых.

Другая гадавіна сацыялістычнага спаборніцтва павінна быць адзначана новым узьдымам ударнага руху і пераводам яго на вышэйшую ступень. Становячыся на чале шырокай актыўнасьці рабочых мас, партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі павінны разгарнуць вялікую работу па забесьпячэньні выкананьня плянаў трэцяга рашаючага году пяцігодкі, па замацаваньні і пашырэньні сацыялістычных форм працы, па поўным перагляде норм выпрацоўкі.

„Беларуска" абяцае ліквідаваць прарыў

Рабочыя, служачыя і адміністрацыйна-тэхнічны персанал фабрыкі **«Беларуска»** прызнаюць, што невыкананьне прамфінпляну ў першым квартале на 8,7 проц. зьяўляецца ганьбай, якая павінна быць змыта на што-б там ні стала. Сход абавязваецца:

1. У другім квартале разгарнуць работу так, каб плян быў выкананы і перавыкананы як па кольласных, так і па якасных паказальніках.

2. Арганізаваць для ўсяго калектыву рабочых тэхнічную гадзіну, а таксама групу прыхільнікаў машыны.

3. Па-баявому правесьці кампанію на перагляде норм.

4. Пачаць кампанію арганізацыі ударных брыгад і «сквозных» імя 518 і 1.040.

6. Да 1-га мая перавесьці на гаспадарчы разрахунак гузікавы цэх.

6. Узмацніць прыцёк вытворчых прапаноў, а таксама хутчэйшае правядзеньне іх у жыцьцё.

7. Правесьці яшчэ большую работу па забесьпячэньні выкананьня плянаў трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Рэзалюцыя ў дзеяньні

Рабочыя зав. «ДРЗВААПРАЦОЎШЧЫК» прыступілі да практычнага ажыццяўленьня рэзалюцыі, якая прынята ў адказ тульскім рабочым.

У зборачным цэху АРГАНІЗАВАНА АДНА АПЭРАЦЫЙНА - ПЛЯНАВАЯ ГРУПА, у якую ўвайшло 8 ударнікаў. У мэханічным цэху АБВЯСЦІЛІ СЯБЕ УДАРНІКАМІ 25 ЧАЛ. Сем рабочых падалі заявы аб прыёме іх У ПАРТЫЮ і 6 маладых рабочых — аб прыёме ў ЧЛЕНЫ ЛКСМБ.

Паступілі заявы ад рабочых зборачнага цэху ГЭЦАВА і КРЫВІЦКАЙ аб зьніжэньні расцэнак на 10 проц. Качагар АРЦЯМЕНЯ ў парадку сустрэчнай нормы абавязаўся ачышчаць кацёл зз АДНУ ГАДЗІНУ замест трох гадзін, якія траціліся раней. На заводзе разгортваецца вялікая работа па практычнай рэалізацыі тых абавязкаў, якія ўзялі на сябе рабочыя да другой гадавіны сацспаборніцтва.

За перагляд норм

На заводзе **«Камунар»** прыступілі да прапрацоўкі пытаньня аб перагляде норм выпрацоўкі. Гэтымі днямі пытаньне будзе абгаворвацца на агульна-заводзкім сходзе, а потым на цэхавых сходах і брыгадах. У ліцкавым цэху ударная брыгада высунула сустрэчныя нормы выпрацоўкі, якія значна вышэй норм ТНВ.

„Ліквідуем прарывы"

Мы бярэм на сябе абавязацельства,—заявілі **менскія абутнікі**, — да другой гадавіны спаборніцтва канчаткова ачысьціць свае рады ад ілжэ-ўдарнікаў і ілжэ-камунараў, якія перашкаджаюць выконваць прамфінпляны, асабліва па якасных паказальніках.

Мы да другой гадавіны спаборніцтва абяцаем ліквідаваць прарыў па якасных паказальніках, выкапаць абяцаньне аб процанце гатункавасьці абутку. Мы патрабуем ад адміністрацыі і грамадзкіх арганізацый палянпшэньня і пашырэньня тэхнічнага курсу навучаньня рабочых.

Апрача таго мы падтрымліваем адозву тульскіх таварышоў да данецкіх вугляконаў. Данбас — уссаюзная качагарка — павінен поўнасьцю выканаць плян забесьпячэньня краіны апалам.

Новых 4 ударныя брыгады

НА ЗАВОДЗЕ **«БАЛЬШАВІК»** ШЫРОКА РАЗГАРНУЛАСЯ ПАДРЫХТОЎКА ДА другой ГАДАВІНЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА. У ПАРАДКУ АЖЫЦЦЯЎЛЕНЬНЯ ПРЫНЯТАЙ РЭЗАЛЮЦЫІ У АДКАЗ ТУЛЬСКАМУ ЗАВОДУ № 1 АРГАНІЗАВАНЫ 4 УДАРНЫЯ БРЫГАДЫ. ПА ЎСІХ ПЭХАХ ВЫЛУЧАНЫ БРЫГАДЫ ДОБРААХВОТНІКАЎ ПА ПРАВЕРЦЫ САЦДАГАВАРОЎ. АБВЕШЧАНЫ КОНКУРС НА ЛЕПШУЮ ЎДАРНУЮ БРЫГАДУ. ШЫРОКА ПРАПРАЦОЎВАЮЦЦА ЎМОВЫ КОНКУРСУ НА БРЫГАДАХ.

Індывідуальны сэктар—адсталы вучастак

МАГІЛЕЎ. Паводле матар'ялаў праверачнай камісіі, кантрактацыя яравых па Магілеўскім раёне праходзіць марудна. Асабліва адстае індывідуальны сэктар, па якім плян кантрактацыі выкананы усяго на 22 проц.; па калгасах—на 83 проц. Таксама слабым месцам застаюцца і тэхнічныя культуры, плян кантрактацыі якіх выкананы: ільну—на 30 проц., канапель на 19 проц. Яравыя заканктрактаваны на раёне ўсяго на 34 проц.

Прыгарадныя гаспадаркі да сяўбы не гатовы

У АБОЗЕ ПЛЯТУЦЦА МЕНСКІ, ВІЦЕБСКІ І ГОМЕЛЬСКІ ЦРК

Падрыхтаваць для прыгарадных гаспадарак рабочыя рукі, забясьпечыць цягавай сілай, скончыць вывазку ўгнаеньня

На адным месцы

У гэтым годзе рабочыя цэнтры палянны быць забясьпечаны прадуктамі прыгарадных гаспадарак МЦРК ня менш як на 80 проц. замест 15 проц. у мінулым годзе.

Выкананьне гэтага заданьня ў большай ступені залежыць ад **падрыхтаванасьці** да поўнага засеву вызначанай плошчы. Неабходна лабіцца ажыццяўленьня пастановы снежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б аб асваеньні плошчы ў 25 тыс. гэкт. над засеў агароднімі культурамі.

Для выкананьня гэтай важнейшай дырэктывы партыі мы маем усе магчымасьці. Толькі трэба паставіць работу так, каб сяўба не застала нашы канцэрацыйныя арганізацыі зьнянацку.

Адтак, гэта своячасова ня ўлічана клапбранцыйнымі арганізацыямі і замест напярэдадні падрыхтоўкі зараз выяўляецца рад прарываў. Вось факты: саўгасам **не хапае каля 1 тысячы чалавек пастаянных рабочых.** На сёньняшні дзень патрэбна далаткова 6.249 чалавек на дзёна - сезонных рабочых. Кантрактацыя барсіны фактычна сарвана. Заканктрактавана толькі 187 чалавек.

У адносінах укамплектаваньня цягавай сілай з надворнага выгляду, як быццам, справа стаіць больш менш здавальняюча. Не хапае ўсяго 366 коней. Белкаапсаюз спадзяецца атрымаць 15 трактараў ад Наркамзему і 6 ад Цэнтрасаюзу. Але апошнія не сьпяшаюцца з выкананьнем гэтага заказу. Пакуль што ЦРК могуць разьлічваць толькі на тыя 11 трактараў, якія ў іх ёсьць, і на наяўную конскую сілу.

Між іншым 1 гэтыя 11 трактараў ня маюць запасных частак. З рамонтам прычэпнога трактарнага і конскага інвэнтару таксама ня вельмі добра.

Да гэтага часу Белкаапсаюз не заключыў дагавораў з МТС. Упаўнаважаны Трактарацэнтру тав. Камаеў упёрся ў літару закону, што «МТС ня могуць апрацоўваць зямлю не ў раёне сваёй дзейнасьці» (?), і толькі таму адмаўляецца заключаць дагавары. На Камаева, як відаць, зусім ня дзейнічае пастанова СНК Беларусі, згодна якой МТС павінны даць прыгарадным гаспадаркам ня менш 80 трактараў для дапамогі ў часе веснавой сяўбы.

Надзвычай дрэннае становішча з вывазкай гною. Вывезена ўсяго толькі **44,3 проц.** У хвасьце Менскі ЦРК які выканаў—32 проц., Гомельскі—33 проц. і Рэчыцкі—35,8 проц.

Недапушчальна марудна завозяцца мінэральныя ўгнаеньні. Усяго завезена **24,4 проц. пляну.** Яшчэ горш з агрыманьнем мешэн для расьсейваньня гэтага ўгнаеньня, няма піводнай тукавай сяўлкі.

На загатоўцы парніковых рам плян выкананы, але толку ад гэтага мала: з 50.800 рам выкапана катлаванаў 4 нарыхтавана скрынь толькі 41.868. Вывезена гною на 33.048 парнікі. З усёй гэтай колькасьці засеяна толькі... 5831.

Закладка парнікоў да тэрміну—15-га красавіка пры такіх тэмпах, якімі працуюць асобныя ЦРК, ня можа быць выкананая.

Вельмі многа пісалася ў друку аб тым, што асобныя ЦРК не атрымалі патрэбнай колькасьці зямельнай плошчы. **Віцебскаму ЦРК** да гэтага часу не адведзілі зямлі, згодна плану. **Шклоўскі ЦРК** ня ведае дзе ён павінен будаваць свае гаспадаркі. Мясцовыя арганізацыі прапанавалі: «Будуйце жывёлагадоўчы пункт на тэй зямлі, якую мы вам далі». А далі Шклоўскаму ЦРК 150 гэкт. пяску і балот. Гэта зямля не падыходзіць ня толькі пад агароднія культуры, але там і трава не расьце.

Такія адносіны да будаўніцтва прыгарадных гаспадарак інакш кваліфікаваць, як праяву правага апартунізму на практыцы, нельга.

Загадчык сельска - гаспадарчага сэктару Белкаапсаюзу тав. **Сулькіна** кажа: «Насеньнем гаспадаркі будуць забясьпечаны поўнасьцю». Адтак, да гэтага часу насеньнем прыгарадныя гаспадаркі забясьпечаны ўсяго на 65 проц.

Нельга не адзначыць і таго, што практычная дапамога з боку асобных партыйных, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый у будаўніцтве прыгарадных гаспадарак прымушае жадаць шмат лепшага.

Трэба раз назаўсёды адмовіцца ад бязьмежнага ліку абсьледаваньняў, якія нічога не даюць і адрываюць кіраўнікоў ад справы.

Брыгады рабочых павінны ў вольны час ад работы на вытворчасьці паехаць у саўгасы, каб там перадаць лепшы мэтад сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Разам з кіраўніцтвам саўгасамі выпрацаваць формы арганізацыі працы і паставіць работу так, як на прамысловых прадпрыемствах. Толькі пры такой пастаноўцы пытаньня, калі работы гораду дапамогуць рабочым саўгасаў перайсьці на ўдарныя мэтады работы, мы зможам вызначыць і перавыкананць пляны на засеве ў прыгарадных гаспадарках.

А. МІНЬКОЎ.

Да вясны не гатовы

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). ЦРК 1, у прыватнасьці, сельска-гаспадарчы сэктар не пераключыўся на базывы тэмпы працы ў справе падрыхтоўкі да веснавой сяўбы прыгарадных гаспадарак ЦРК. У апараце ЦРК панує самацёк.

З боку гарсавету, сампрамкаапэрацыі і райкалгассаюзу не аказваецца ЦРК належнай дапамогі па лініі прыгарадных гаспадарак. Шэфскія арганізацыі сьпяць.

У выніку такога становішча падрыхтоўка да сяўбы знаходзіцца пад пагрозай зрыву. Вось прыклады. Плян вывазу гною выкананы на 26 проц., збор попелу — на 13 проц., штучнага ўгнаеньня завезена 15 проц. Гародняе насеньне амаль адсутнічае. Нарады ЦКС ня выканаць. Рамонт інвэнтару праходзіць павольна. Не хапае вугалю, які сампрамкаапэрацыя катэгарычна адмовілася адпусьціць. Шмат інвэнтару, не хапае 54 параконных плугі, 25 борон, сявярак і т. д.). Фуражныя фонды на складзены.

Кваліфікаваный рабочай сілай (агрономы, тэхнікі) гаспадаркі не забясьпечаны. Штатнымі рабочымі — на 79 проц., сэзоннымі — на 15 проц.

Раённыя арганізацыі пачэпны ўлічыць, пагражаючае становішча в падрыхтоўкай да сяўбы прыгарадных гаспадарак. Трэба неадкладна перабудаваць, каб вясну сустрэць у поўнай гатоўнасьці.

Бяз удзелу рабочых

На тэрыторыі **Семянецкага і Экімаскага сельсаветаў** (Полаччына) арганізавана прыгарадная гаспадарка ЦРК, але работа бядзецца злачынна слаба. Так, нічога невядома аб разьмеры насеўнай плошчы, у той час, як давядзеньне плянаў сяўбы да кожнага рабочага павінна было скончыцца да 1-га лютага гэтага году. Якідзе і ці праводзіцца нагул рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтару — рабочым невядома.

Рабочыя паогул зусім ня ведаюць аб мерапрыемствах, якія ажыццяўляюцца адміністрацыяй, бо сходы не праводзяцца, усякая растлумачальная работа адсутнічае, і адміністрацыя ня імкнецца прыцягваць рабочых да абгаварэньня тых ці іншых пытаньняў і мерапрыемстваў.

Вясна ўжо не за гарамі і да пачатку ворыва можна было вывозіць гной, але гэты час не выкарыстоўваецца, адміністрацыя чагосьці чакае і на штосьці спадзяецца.

Зараз распачата работа па прыстасаваньні хлявоў, будуюцца кармушкі, але і тут ёсьць недахопы. Прывязі ў абставяны хлеў 6 кароў, а кармы для гэтых кароў не адабраны. Жывёла пры мушана стаяць галоднай.

Да зімы наступнага году павінны быць пабудаваны цёплыя хлявы для жывёлы, але загатоўка лесаматар'яла праходзіць надзвычай марудным тэмпам.

Надалей такога становішча нельзя дапусьціць. Трэба наладзіць шырокі ўдзел рабочых у выкананьні вытворчых праграм.

Не марудзячы, павінны быць ужыты рашучыя захады да таго, каб вясна была спаткана ў поўнай гатоўнасьці і каб кожны рабочы меў сваё месца ў гэтай рабоце. Памылкі, якія ёсьць у рабоце прыгарадной гаспадаркі, павінны быць выпраўлены на-хаду. Вясна адтэрміноўваньня ня дасьць. Гэта трэба памятаць кіраўніцтву прыгарадной гаспадаркі.

Ан. П—І.

Першыя крокі зроблены

Менская абутковая фабрыка за апошні перыяд дабілася некаторых дасягненьняў у рабоце на шэфстве **над прыгарадной гаспадаркай імя Лекерта.**

Сацыяльна-бытавым сэктарам у гэту справу ўцягваецца рабочы актыў. У выходныя дні ў падшэфнай гаспадарцы працуюць рабочыя брыгады, якія многа зрабілі на лініі разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва, аказалі вялікую дапамогу падшэфнікам.

Трэба, адпак, адзначыць, што масавасьць вакол работы па шэфстве ўсё яшчэ невыстарчальная, у прыватнасьці фабком праяўляе некаторую недаацэнку значэньня дапамогі прыгарадной гаспадарцы.

Л. Фрыд.

Палепшыць работу экспэдыцыі

Прыняўшы больш году таму назад ад выдавецтваў экспэдыраваньне газэт і часопісяў, газэтнае бюро на гэтым сьпынілася. Пытаньням вывучэньня работы экспэдыцыі, з мэтай лепшай арганізацыі, палянпшэньня якасьці экспэдыраваньня друку увесь час газбюро амаль не займаецца. Між тым, у экспэдыцыях **многа непаладак**, якія адбіваюцца на нармальным забесьпячэньні падпісчыкаў газэтамі.

Газэты на перыферыю накіроўваюцца пасылкамі, прычым упакоўка і вязка робіцца дрэнна. У выніку пры бассыцтовай разгрузцы і нагрузцы ў вагон, накладныя пасылак часта абрываюцца і такія пачкі газэт з-за адсутнасьці адрасу правозяцца ад станцыі да станцыі, а потым або і варачаюцца назад у газбюро, або часам прападаюць у дарозе. Як месяц расцэньваць, што **за адзін дзень 25 сакавіка пачка ў 600 экз. «Зьвязды» (без накладной) нейкім чынам трапіла ў г. Рагачоў. Таксама пачка ў 122 экз. «Зьвязды» (без накладной) папала ў Жлобін.** Гэта толькі за адзін дзень на віне экспэдыцыі 722 падпісчыкі «Зьвязды» не атрымалі газэты. Такія пасылкі газэт (менскіх) варачаюцца з перыферыі ў газбюро амаль штодзённа, нават па некалькі адразу. А сотні, тысячы падпісчыкаў чакаюць атрыманьня выпісаных імі газэт і часопісяў.

Упакоўка газэтных пасылак у паперу амаль ня робіцца, у той-жа час пры разгрузцы кідаюцца яны абы куды і як попала (на мокры і брудны памост і г. д.), дзякуючы чаму **падпісчык атрымлівае не газэты для чытаньня, а проста макулятурную паперу нізкай якасьці.**

Недасылкі газэт і часопісяў маюць месца ў рабоце экспэдыцыі, асабліва адзначаецца ў гэтым экспэдыцыі пры друкарні імя Сталіна, дзе сыстэматычна не дасылаюцца газэты нават на адрасох. Напрыклад, № 16 (ад 29 сакавіка) газэта «Раўдонасіс Артояс» (на літоўскай мове) не даслана на 100 адрасох, дзе экспэдыцыя дазнала адрасы, невядома. Экспэдытары прабавалі тлумачыць, што гэта колькасьць экзэмпляраў нібы адпраўлена ўжо на станцыю, аднак, пры праверцы на станцыі не аказалася. Астача была дана ў 225 экз., прычым друкарня звыш таго, што паказана ў нарадзе, ня друкуе.

Затрыманьне выхаўных з друку нумароў часопісяў — ёсьць сыстэма работы экспэдыцыі. Так, нумар 8 часопісі «Бел. работніца і сялянка» быў затрыман на 2 дні; «Партыйны работнік» № 3-4 на 3 дні. Наогул усе нумары часопісяў затрымліваюцца на 2-3 дні, а некаторыя колькасьці тыражу часам і больш.

Экспэдыцыя пры друкарні імя Сталіна праз кожныя 6 дзён мае выхадны. Газэты-ж, якія выдаюцца праз 2-3 дні, або раз у пяцідзённу прыпадаюць выхадам нумароў у розныя дні месяца. Адсюль і ўзьнікае некаторая недакладнасьць, якая адбіваецца на своячасовай дастаўцы газэт. Так, напрыклад, газэта **«Орка»** друкуецца 4-га красавіка ўдзень, а 5 красавіка ў экспэдыцыі выхадны. Такім чынам **экспэдыраваньне газэты будзе рабіцца толькі 6 красавіка.** Тое-ж самае сыстэматычна бывае і з іншымі выданьнямі. Пытаньне гэта некалькі раз ставілася перад адміністрацыяй газбюро, але належнага вырашэньня не атрымала. Наадварот, загадчык газбюро і яго намесьнік проста заяўляюць: **«Як гэта так, рэдакцыя выпускае нумар газэты, ня лічачыся з выхаднымі днямі экспэдыцыі».** Таварышы з газбюро адкажэце, з якога гэта часу газэта павінна абслугоўваць экспэдыцыю, а не наадварот. Ці не з таго, як газбюро прыняло экспэдыраваньне.

З абменам пошты паштовымі аддзяленьнямі і агенцтвамі ня зусім добра. Часта ня робяць абмену Дуброўна, Асінбуд, Шамава, таму газэты правозяцца да Смаленску, а на заўтра назад на Воршу. Асабліва дрэнна стаіць гэта справа на вучастку Ворша-Унеча. Сыстэматычна **не абменьваюць пошту Горы-Горкі, Крычаў, Хоцімск, Клімавічы,** таму часта бывае, што газэты правозяцца з Воршы на Унечу, з Унечы на Воршу па некалькі раз. **Ня так даўно газэты для Клімавіч праваляліся ў вагоне цэлы тыдзень.**

Вось частка недахопаў у рабоце экспэдыцыі і паштовага апарату, якія вельмі адбіваюцца на своячасовай дастаўцы друку падпісчыкам і патрабуюць неадкладнага вырашэньня. Слова за грамадзкасьцю і Наркамшляхам.

П.

Агляд друку

У барацьбе за фінплян

Бабруйскі „Камуніст", чырвона-слабодзкі „Калгасьнік" і „Рэчыцкая праўда"

ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове ад 26-га сакавіка канстатаваў, што «У рэдзе раёнаў кіруючыя арганізацыі не ўявілі сабе ўсёй важнасьці выкананьня фінансавага пляну, як рашаючага заданьня ўсяго народна-гаспадарчага пляну, і не мабілізавалі ўвагі партарганізацый і грамадзкасьці на вырашэньне фінансавых задач першага кварталу. У выніку плян мабілізацыі сродкаў насельніцтва на 20-га сакавіка выкананы зусім нездавальняюча (67,3 проц. пляну цэнтру і 64,8 проц. пляну, прынятага ў БССР)».

Віна за тэты прарыў у значнай ступені бязумоўна падае на друк, у тым ліку і на раённыя газэты.

Перад намі камплект раённых газэт: **«Камуніст»** (Бабруйскі раён), **«Калгасьнік»** (Чырвонаслабодзкі) і **«Рэчыцкая праўда»** (Рэчыцкі раён) за сакавік—ударны і рашаючы месяц па выкананьні фінпляну 1-га кварталу.

З вышэйпамянёных газэт **толькі** бабруйскі **«Камуніст»** рашуча змагаўся за фінплян першага кварталу. 13-га сакавіка «Камуніст» зьмясьціў вялікую падборку пад загалоўкам **«Да першага красавіка ліквідаваць прарывы».** У гэтай падборцы газэта канстатуе, што выкананьне фінпляну **ідзе незадавальняюча,** і б'е на канкрэтных посьбітах ала. 21-га сакавіка «Камуніст» сьмяецца: «Фінпляны у небясьпецы». Газэта заклікае: **«Мацней удар па правааапартуністычных адносінах да мабілізацыі сродкаў. Пінуць усе сілы на поўнае выкананьне кантрольных лічбаў».**

Аналізуючы прычыны прарываў у выкананьні фінпляну, газэта піша:

«Чым тлумачыцца такое недавыкананьне фінпляну, які зьяўляецца абсалютна рэальным? Тлумачыць гэта можна толькі правааапартуністычнай недаацэнкай значэньня мабілізацыі сродкаў, якая нагадваецца ў практыцы значнай часткі прадпрыемстваў і ўстаноў. Мы павінны крыва зараз-жа паставіць пытаньне аб ліквідацыі гэтых ганебных прарываў. Неабходна зараз-жа мабілізаваць увесь гарадзкі актыў і ў першую чаргу усе камісіі сядзейнасьці».

У далейшых нумарох (за 26-га, 28-га сакавіка) «Камуніст» не перастае біць трывогу, сыгналізаваць аб небясьпецы на фінансавым фронце. Газэта патрабуе: **«Апошнія дні сакавіка павінны стаць днямі поўнай ліквідацыі прарываў, поўнага выкананьня абавязацельстваў перад дзяржавай».**

У выніку гэтага рашучага змаганьня за фінплян Бабруйскі раён стаў адным з раёнаў, які з посьпехам выконвае фінплян, як гэта адзначана ў пастанове ЦК. У гэтай справе, бязумоўна, адыграла вялікую ролю раённая газэта «Камуніст».

Зусім інакш вяла барацьбу за выкананьне фінпляну чырвона-слабодзкая раённая газэта **«Калгасьнік».** На працягу ўсяго сакавіка газэта амаль зусім не аддавала ўвагі пытаньням мабілізацыі сродкаў.

Як змагаецца газэта за рэалізацыю акцый Трактарацэнтру? 10-га сакавіка ў газэце быў зьмешчан адзін артыкул пад загалоўкам **«МТС—апорны пункт».** У гэтым артыкуле толькі мімаходам упамінаецца аб акцыях Трактарацэнтру.

Другі артыкул быў зьмешчан у «Калгасьніку» 20-га сакавіка пад загалоўкам **«Будаўніцтва МТС і масавая работа».** У гэтым артыкуле газэта абмяжоўваецца ў адносінах рэалізацыі акцый Трактарацэнтру толькі адной агульнай фразай:

«І, нарэшце, павінна быць разгорнута і ўзмоцнена работа па прыцягненьні сродкаў насельніцтва на будаўніцтво МТС, галоўным чынам, шляхам рэалізацыі акцый Трактарацэнтру».

Вось усё, што зрабіў «Калгасьнік» для распаўсюджаньня акцый Трактарацэнтру. На працягу ўсяго сакавіка былі зьмешчаны толькі 2 артыкулы і на гэтым... пастаўлена крошка.

«Рэчыцкая праўда» не на многа выперадзіла газэту «Калгасьнік». 3-га сакавіка «Рэчыцкая праўда» зьмясьціла перадавую на пытаньні аб аднаразовым зборы. На гэтым газэта паставіла крокпаў. У далейшых нумарох няма ніводнага слова аб мабілізацыі сродкаў, аб ліквідацыі прарыву на фінансавым фронце.

Толькі 20-га сакавіка «Рэчыцкая праўда» «ўспомніла» аб фінпляне. У артыкуле пад загалоўкам **«Баявыя задачы спажывецкай кааперацыі»** газэта піша:

«Выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў, мабілізацыі унутраных рэсурсаў, зэкатовак усіх відаў—вось баявая задача, якая ў самы кароткі тэрмін з посьпехам павінна быць выканана. Мабілізацыя на гэта ўсіх сіл, сацспаборніцтва—вось мэтады, якія павінны быць шырока ўжыты і да гэтага часу не скайшлі месца ў рабоце кааперацыі».

У гэтым артыкуле газэта нават і не закранула пытаньняў збору паёў, авансаў і г. д.

Такія адносіны да мабілізацыі сродкаў, да выкананьня фінпляну нельга інакш кваліфікаваць як праўдзівае правага апартунізму. **Чырвона-Слабодзкі «Калгасьнік» і «Рэчыцкая праўда» недаацэнілі важнасьці барацьбы за фінплян.**

Раённыя газэты павінны неадкладна выправіць дапушчаныя памылкі. У другім квартале газэты павінны **значна** працягваць шырокую мабілізацыю насельніцтва на ліквідацыю прарываў першага кварталу і на поўнае выкананьне фінпляну.

Аб арганізацыі прыгарадных гародаў

ПАСТАНОВА ПРЭЗЫДЫУМУ ЦСПСБ

Выходзячы з пастановы камісіі выкананьня пры СНК СССР па арганізацыі прыгарадных гародаў, — прэзыдыум ЦСПСБ пастанаўляе:

1. У мэтах своячасовага асваеньня гародаў ЦРК і пасьпяховага правядзеньня пасеву, догляду і ўборкі, забясьпячэньня рабочых, іх сем'яў і заводзкіх сталовых гародзінай, — даручыць ЦП саюзаў, гарпрафсаветам і райпрафсаветам правесьці сумесна з ЦРК дадатковае прымацаваньне ўсіх прадпрыемстваў гарадоў да прыгарадных гаспадарак ЦРК з разьліку прадастаўленьня кожным рабочым данага прадпрыемства ня менш аднаго рабочага дня ў месяц, згодна пастановы ЦСПСБ.

2. Абавязаць ЦРК і фабкомы арганізаваць прымацаваньне гародных вучастка ў адпаведнымі ДАГАВАРАМІ паміж фабкомамі і ЦРК.

3. У дагаворах трэба прадугледзець ініцыясьць працоўных дзён, якія адводзяцца рабочым калектывам данага прадпрыемства, каляндарны плян працы, арганізацыю правільнага скарыстаньня рабочай сілы, уліку працоўных дзён і выкананьня норм выпрацоўкі, першачарговага забясьпячэньня гародзінай калектываў, выканаўшых плян забясьпячэньня рабочай сілай, і дадатковай нормай гародзіны для тых груп рабочых, якія поўнасьцю выконваюць свае нормы.

4. Абавязаць фабкомы:

а) Правесьці сходы рабочых, на якіх павінны быць растлумачаны абавязацельствы па прыманых дагаворах.

б) Вылучыць асобных упаўнаважаных на якіх усклясьці адказнасьць за выкананьне дагавораў, вызваліўшы гэтых асоб ад усякіх іншых грамадзкіх нагрузак.

5. Праект тыпавога дагавору, распрацаваны сац.-быт. сэктарам ЦСПСБ і Белкаапсаюзам, — зацьвердзіць.

6. Усю работу правесьці ў дэкадны тэрмін.

Бюро парт'ячэйкі хромавага цэху заводу «Бальшавік»

Задачы 1-га зьезду

рабочых чыгуначнага, партова-дарожнага будаўніцтва

9 красавіка ў г. Менску адкрываецца 1-шы ўсебеларускі зьезд рабочых чыгуначнага, партова-дарожнага будаўніцтва.

Задачы, высунутыя ленінскай камуністычнай партыяй перад рабочай клясай у трэцім рашаючым годзе пяцігодкі патрабуюць ад кожнага прафсаюзнага зьезда рашучай перабудовы работы, ад поўнага і больш канкрэтнага ажыццяўленьня павароту тварам да вытворчасьці.

Адным з фактараў перабудовы прафработы зьяўляецца разбудаваньне прафсаюзаў, у тым ліку і саюзу будаўнічых рабочых.

1-шы ўсебеларускі зьезд рабочых чыгуначнага, партовага і дарожнага будаўніцтва павінен вырашыць рад пытаньняў па практычным ажыццяўленьні пастановы V пленуму ЎсеЦСПО.

Асноўнай умовай, якая забясьпечвае поўнае выкананьне ў тэрмін плянаў будаўніцтва, [illegible] сацыялістычных форм працы, [illegible] ударніцтва, [illegible] і [illegible] рабочых.

Трэба адзначыць, што **ахоп сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам у сучасны момант рабочых нашага саюзу зьяўляецца, бязумоўна, невыстарчальным.** Нашы саюзныя ячэйкі і ЦП саюзу, якое трэба выбрана на зьезьдзе, павінны накіраваць усю сваю ўвагу на далейшую мабілізацыю рабочых мас нашага саюзу на выкананьне канкрэтных задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі на падставе разгортваньня сацспаборніцтва, ударніцтва, сустрэчных прамфінпляну.

Вытворчыя нарады на пабудовах яшчэ ня сталі штабам барацьбы за будаўнічыя пляны, за зьніжэньне сабекошту і за палянпшэньне якасьці будаўніцтва. Зьезд павінен прыняць рад мер, каб вытворчыя нарады сапраўды сталі масавымі арганізацыямі ў справе палянпшэньня ходу будаўніцтва па ўсіх паказальніках як якасных, так і колькасных.

Працент ахопу рабочых саюзным членствам (17,6 проц.) [illegible] зусім невыстарчальным. Зьезд павінен прыняць [illegible] аб [illegible] рабочых [illegible] на [illegible] народна-гаспадарчых [illegible] трэцяга [illegible] пяцігодкі [illegible] рабочых [illegible] і [illegible] фашызму ў барацьбе з рэвалюцыйным рухам і ў падрыхтоўцы вайны супроць СССР.

в) Вынікі першага кварталу трэцяга году пяцігодкі і далейшыя задачы рабочай клясы.

Правядзеньне гэтых гутарак павінна мабілізаваць працоўных на барацьбу за перавыкананьне пляну, на барацьбу за новыя калгасы, на абарону краіны Саветаў, за зьнічэньне рэлігійных сьвят.

6) Правесьці агляд інтэрнацыянальнай работы на прадпрыемствах, калгасах і саўгасах. Патрэбна арганізаваць перакліч нашых заводаў і фабрык з рабочымі капіталістычных краін. Разгарнуць работу на ўцягненьні новых тысяч працоўных у МОПР і дапамогу змагаром рэвалюцыянэрам—палітвязьням сусьветнага імпэрыялізму.

Наладзіць масавыя дэ

Зьлёт батрацка-бядняцкіх груп Меншчыны

„З КОЖНЫМ ДНЁМ МАЦНЕЮЦЬ ПАДПОРЫ КАЛЕКТЫЎНАЙ ГАСПАДАРКІ“

„КАЛГАСЬНІК СТАЎ НАДЗЕЙНАЙ І МОЦНАЙ АПОРАЙ РАБОЧАЙ КЛЯСЫ НА ВЁСЦЫ“

„Кулаку ня сьпыніць калгаснага руху“—заявілі дэлегаты зьлёту ў адказ на забойства кулакамі калгасьнікаў Шайко С. і Шайко К.

9 красавіка

Учора ў залі гаркому КП(б)Б у надзвычай напружанай атмасфэры адкрыўся зьлёт батрацка-бядняцкіх груп Менскага раёну.

Зьлёт адкрыўся інфармацыяй т. ВАЛОДЗЬКІ, які паведаміў аб правакацыйным выпадзе клясавага ворага. У гэты-ж самы дзень, за некалькі гадзін да адчыненьня зьлёту кулацкі агент, натхнёны кулаком і кеяндзом, засёк сякерай двух калгасьнікаў-актывістаў з калгасу «Перамога»,—Карапішчанскага сельсавету—т. т. ШАЙКО С. і ШАЙКО К. Вестку гэту прадстаўнікі батрацка-бядняцкіх груп сустрэлі агульным абурэньнем. Вынесена рэзалюцыя, у якой яны дамагаюцца дастасаваньня да наглых ворагаў, да выканаўцы, у першую чаргу да яго НАТХНІЦЕЛЯЎ,—РАСТРЭЛУ З КАНФІСКАЦЫЯЙ МАЁМАСЬЦІ. Трэба на гэтым прыкладзе паказаць усім зарваўшымся бандытам, што дыктатура пралетарыяту не пазволіць бяскорна тэрарызаваць будаўнічую ковай вёскі.

Пасьля гэтага тав. ВАЛОДЗЬКА зрабіў даклад аб выніках 6 усесаюзнага зьезду Саветаў, што зьяўляецца першым пунктам парадку дня зьлёту.

У разгорнутай пасьля дакладу дыскусіі выступаўшыя батракі і беднякі—калгасьнікі і аднаасобнікі—паказалі перад фактам актыўнага выступленьня клясавага ворага сваю маналітнасьць, сваю згуртаванасьць вакол ленінскай партыі.

Выступаўшыя калгасьнікі з радасьцю гаварылі аб разьвіцьці сваіх калгасаў, канстатуючы факт вялізарнай перавагі калектыўнай, буйной гаспадаркі над дробнай, аднаасобнай.

— Я—батрачка,—гаворыць тав. Савінкава,—за ўвесь час майго батрацтва кулакі мяне эксплёатавалі, і за кавалак хлеба яны казалі кланяцца і зьдзекваліся. Я шмат перанесла. І вось цяпер я ўступіла ў калгас. Жыцьцё зьмянілася. Нікому ня трэба кланяцца, ніхто ня зьдзекуецца. Я працую вольна і жывецца мне ў тысячу разоў лепш.

Выступаўшыя таксама не абмінулі і недахопаў, якіх пакуль што шмат ёсьць у калгасах. Адным з цікавых выступленьняў з гэтага боку зьяўляецца выступленьне тав. Тарасэйча, сэнс прамовы якога зводзіцца да доказу, што ў калгасах крыніцай усіх недахопаў зьяўляецца дрэнная арганізацыя працы, гультайства паасобных членаў калгасаў—вынік яшчэ не зламанай старой псыхалёгіі і дрэнная сыстэмы разьдзелу даходу.

РАШАЮЧЫМ ФАКТАРАМ У СТВАРЭНЬНІ НОВЫХ АДНОСІН ДА ПРАЦЫ Ў КАЛГАСАХ БУДЗЕ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНА. Да яе іменна ў сваіх выступленьнях, гаворачы аб недахопах арганізаванасьці ў калгасах, часам напоўсьвядома, вобмацкам імкнуцца ўсе выступаючыя.

УСЕ ЎДЗЕЛЬНІКІ ЗЬЛЁТУ, якія дагэтуль яшчэ заставаліся аднаасобнікамі, У АДКАЗ ВОРАГУ АДНАДУШНА ПАСТАНАВІЛІ ЎСТУПІЦЬ У КАЛГАСЫ.

Зьлёт пастанавіў зьвярнуцца да ўсіх батракоў, беднякоў і сераднякоў Меншчыны і ўсёй Савецкай Беларусі з заклікам пайсьці за іх прыкладам. Ніякім тэрарыстычным гвалтам з боку адміраючых кляс ня спыніць пераможнага калгаснага руху. Кожны выпад з іх боку выклікае новую хвалю калгаснага прыліву, новую хвалю творчага энтузіязму і самы жорсткі, бязлітасны адпор.

10 красавіка

Другі дзень зьлёту батрацка-бядняцкіх груп Меншчыны распачаўся рапартам роты сувязі 2-й Беларускай дывізіі імя Фрунзе.

З адказам выступіў дэлегат тав. Грыгарэвіч.

— Няма такой сілы — казаў ён — якая-б змагла разьбіць Чырвоную армію. Чырвоная армія — гэта мы: рабочыя, калгасьнікі, батракі, беднякі, сераднякі і ўсе працоўныя. Нядаўнія Пісудскія ведаюць, што ў выпадку патрэбы на першы заклік партыі мы ўсе, як адзін, увальемся ў сталёвыя рады Чырвонай арміі і так ударым, што ад панаў мокрага месца не застанецца!

Далей калгасьнікі з вялікай увагай праслухалі даклад тав. Каранёўскага аб падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай весны, зварачаемся з заклікам да вас—усіх батракоў, беднякоў аднаасобнікаў Менскага раёну і ўсёй БССР.

НЕ АДКЛАДВАЙЦЕ ВАШАГА ЎСТУПЛЕНЬНЯ Ў КАЛГАС

У нас адна дарога—з рабочай клясай і пад яе кіраўніцтвам, разам з усім калгасным сялянствам змагацца за калгас супроць кулака. Шлях калгасаў праведраны жыцьцём.

У інтарэсах батракоў, беднякоў і сераднякоў не адтэрміноўваць уступленьня ў калгас.

VI усесаюзны зьезд саветаў падняў вышкі калгаснага будаўніцтва, якія з усёй красамоўнасьцю гаворэць аб перавагах калгасаў і выгоднасьці для батрака, бедняка і сераднякa калгаснага жыцьця. Гэтыя пераваг і выгоднасьці выразнасьцю відаць на практыцы работы нашых калгасаў. **Прыбытак калгасьнікаў у паўтара-два разы большы, чым прыбытак дробнай бядняцка-серадняцкай гаспадаркі.**

Вось што прымушае скрыгатаць зубамі кулацкае, чэпмана і ўсіх ворагаў, якіх зьмятае са свайго шляху пераможны рух сацыялістычнага будаўніцтва.

Паперакор прароцтву і крканьням правых апартуністаў і іх «левых» падпіваў з **кожным днём мацнеюць падпоры калектыўнай гаспадаркі. Калгасьнік стаў надзейнай і моцнай апорай рабочай клясы на вёсцы.**

Зьезд саветаў пастаніў перад кожным бедняком і сераднякам аднаасобнікам пытаньне: за ці супроць калгасаў. Мачуны прылыў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калгасы гаворыць аб тым, што беднята і серадняк пастаўленае пытаньне вырашаюць на карысьць калгасаў, супроць кулака, за ліквідацыю яго як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі.

Задача кожнага бедняка і сераднякa—аднаасобніка безадкладным вырашэньнем гэтага пытаньня, неадкладным уступленьнем у калгасы панесьці руйнуючы ўдар па кулацтве, забясьпечыць поўную магчымасьць на аснове суцэльнай калектывізацыі вырваць з карэньнем гэту апошнюю апору ўсіх контрэвалюцыянэраў і інтэрвэнтаў.

Да ўсіх батракоў, беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў Менскага раёну і ўсёй БССР.

Мы, батракі і беднякі Менскага раёну, сабраўшыся на зьлёт батрацка-бядняцкіх груп для абгаварэньня пастановы VI усесаюзнага зьезду саветаў і падрыхтаванасьці да другой бальшавіцкай весны, зварачаемся з заклікам да вас—усіх батракоў, беднякоў аднаасобнікаў Менскага раёну і ўсёй БССР.

НЕ АДКЛАДВАЙЦЕ ВАШАГА ЎСТУПЛЕНЬНЯ Ў КАЛГАС

У нас адна дарога—з рабочай клясай і пад яе кіраўніцтвам, разам з усім калгасным сялянствам змагацца за калгас супроць кулака. Шлях калгасаў праведраны жыцьцём.

У інтарэсах батракоў, беднякоў і сераднякоў не адтэрміноўваць уступленьня ў калгас.

VI усесаюзны зьезд саветаў падняў вышкі калгаснага будаўніцтва, якія з усёй красамоўнасьцю гаворэць аб перавагах калгасаў і выгоднасьці для батрака, бедняка і сераднякa калгаснага жыцьця. Гэтыя пераваг і выгоднасьці выразнасьцю відаць на практыцы работы нашых калгасаў. **Прыбытак калгасьнікаў у паўтара-два разы большы, чым прыбытак дробнай бядняцка-серадняцкай гаспадаркі.**

Вось што прымушае скрыгатаць зубамі кулацкае, чэпмана і ўсіх ворагаў, якіх зьмятае са свайго шляху пераможны рух сацыялістычнага будаўніцтва.

Паперакор прароцтву і крканьням правых апартуністаў і іх «левых» падпіваў з **кожным днём мацнеюць падпоры калектыўнай гаспадаркі. Калгасьнік стаў надзейнай і моцнай апорай рабочай клясы на вёсцы.**

Зьезд саветаў пастаніў перад кожным бедняком і сераднякам аднаасобнікам пытаньне: за ці супроць калгасаў. Мачуны прылыў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калгасы гаворыць аб тым, што беднята і серадняк пастаўленае пытаньне вырашаюць на карысьць калгасаў, супроць кулака, за ліквідацыю яго як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі.

Задача кожнага бедняка і сераднякa—аднаасобніка безадкладным вырашэньнем гэтага пытаньня, неадкладным уступленьнем у калгасы панесьці руйнуючы ўдар па кулацтве, забясьпечыць поўную магчымасьць на аснове суцэльнай калектывізацыі вырваць з карэньнем гэту апошнюю апору ўсіх контрэвалюцыянэраў і інтэрвэнтаў.

Ня ў нашых інтарэсах адкладваць уступленьне ў калгас

Бедняком і сераднякам аднаасобнікам адна дарога—разам з рабочай клясай, з калгасным сялянствам змагацца за калгас супроць кулака

Wі усесаюзны зьезд саветаў паплраў кожнага бедняка і сераднякa аднаасобніка, што нельга стаяць у баку, нельга быць нейтральным. Той бядняк і серадняк, які разам з кулаком выступае супроць калгасаў, ня толькі не вынуўляецца саюзьнікам рабочае клясы, а, наадварот, дапамагае кулаку шкодзіць калгаснаму будаўніцтву.

«ДРОБНАЙ ГАСПАДАРКАЙ З ГАЛЕЧЫ НЯ ВЫЙСЬЦІ» (Ленін).

Да канца ўсьвядоміўшы гэта ленінскае палажэньне, уразумеўшы, што адзіны выхад з беднасьці—калгас—мы, батракі, беднякі—аднаасобнікі, прысутныя на першым зьлёце батрацка-бядняцкіх груп Менскага раёну, уступаем у калгас.

Таварышы батракі, мы заклікаем вас кідаць работу ў кулакоў. Ператварыцеся ў перадавых ня вёскі новага калгаснага прыбою.

Таварышы беднякі і сераднякі—аднаасобнікі!

Беспаваротна вырашайце пытаньне—за калгас, супроць кулака і яго прыхлябацелаў.

Уступленьнем у калгас да пачатку сяўбы вы будзеце спрыяць поўнаму выкананьню бальшавіцкіх пляноў, павышэньню моцнасьці сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі.

Вягучы год зьяўляецца рашаючым у выкананьні пяцігодкі за чатыры гады, у выкананьні задачы «на канца пяцігодкі скончыць у асноўным калектывізацыю СССР».

У 1931 г. рабочая кляса пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі пускае ў ход 518 новых заводаў і фабрык, 1.040 машына-трактарных станцый.

Гэтыя лічбы павінны запаліць энтузіязмам ня толькі кожнага рабочага і калгасьніка, але кожнага бедняка і сераднякa аднаасобніка. Пасьляховае выкананьне задач, пастаўленых партыяй і ўрадам у трэцім годзе пяцігодкі, патрабуе напружаньня ўсіх сіл, мабілізацыі энэргіі волі ўсіх парэдовых на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, пляну сяўбы і калектывізацыі.

Беднякі і сераднякі—аднаасобнікі!

Уступайце ў калгас, станавецеся ў рады надзейнай і асноўнай апоры рабочае клясы на вёсцы!

Пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі аддана змагайцеся за поўнае выкананьне задач трацяга году пяцігодкі, за пасьляховае завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі!

Змагаліся і будзем змагацца за калгас

КІРАЎНІКУ І АРГАНІЗАТАРУ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА — ЛЕНІНСКАМУ ЦК КП(б)Б — ШЧЫРАЕ БАЛЬШАВІЦКАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ АД ПЕРШАГА ЗЬЛЁТУ БАТРАЦКА-БЯДНЯЦКІХ ГРУП МЕНСКАГА РАЁНУ

Над выпрабаваным кіраўніцтвам камуністычнай партыі і ае ленінскага ЦК БССР ад дапамозе ўсяго Савецкага Саюзу пераможна будзе сацыялізм. Выконаецца пяцігодка за чатыры гады, растуць новыя фабрыкі і заводы. Шпаркім тэмпам ідзе перабудова вёскі на сацыялістычны лад. Асноўная маса сялянства — беднякі, батракі і сераднякі, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі аб'ядналіся ў калгасы, праводзяць суцэльную калектывізацыю і на гэтай падставе—ліквідацыю кулацтва як клясы. Перад кожным бедняком і серадняком аднаасобнікам пастаўлена пытаньне «за ці супроць калгасу». Мы, удзельнікі зьлёту, змагаемся і будзем змагацца за калгас.

Мы заяўляем ЦК КП(б)Б, што ўсе сілы аддамо на выкананьне задач, пастаўленых партыяй у другую бальшавіцкую вясну.

Нахай жыве камуністычная партыя—кіраўнік і арганізатар сацыялістычнага будаўніцтва.

Нахай жыве і шырыцца калгасны рух.

„Зьвязьдзе“

Змагару за генэральную лінію партыі, арганізатару рабочае клясы, калгасьнікаў, бядняцка-батрацкіх і сераднякіх мас—газэце «Зьвязда» ад імя бядняцкіх мас Менскага раёну зьлёт батрацка-бядняцкіх груп шле сваё шчырае прывітаньне.

Пад кіраўніцтвам КП(б)Б і ае ленінскага ЦК газэта «Зьвязда» мабілізуе рабочую клясу, калгасьнікаў, батрацка-бядняцкія і сераднякіх масы на пабудову сацыялізму ў нашай краіне. ЦО па-бальшавіцку мабілізавала масы на барацьбу за чыстату генэральнай лініі партыі, змагаючыся на два фронты супроць правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі, супроць «левых» загібаў, супроць права-«лявацкага» блёку і прымірэнчых адносін да іх. У барацьбе за перабудову вёскі на сацыялістычны лад, у барацьбе з прыцтчэпаўшчынай «Зьвязда» высока трымае ленінскі сьцяг, арганізоўвае бядняцка-батрацкія і сераднякіх масы на барацьбу за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, на барацьбу з кулацтвам. «Зьвязда» па-бальшавіцку мабілізуе масы на выкананьне пляну другой пасеўнай кампаніі. Мы, удзельнікі зьлёту, запэўняем газэту «Зьвязда», што ўсе сілы, усю энэргію аддамо справе падрыхтаванасьці да правядзеньня другой бальшавіцкай вясны.

Скончэньне генэральнай праверкі падрыхтаванасьці да сяўбы, мы адзначым новым калгасным прылівам

За бальшавіцкую сяўбу!

Нахай жыве КП(б)Б—арганізатар сацыялістычнага будаўніцтва!

Нахай жыве газэта «Зьвязда»—арганізатар мас на пабудову сацыялізму!

Арганізацыя саветаў культурнага будаўніцтва

Прэзыдыум ЦВК БССР пастанавіў арганізаваць саветы культурнага будаўніцтва пры Наркамасьвеце, саветах і райвыканкомах. У абавязкі саветаў культбудаўніцтва ўваходзіць: прапрацоўка агульных пляноў культурнага будаўніцтва; салдзейнасьць і кантроль за выкананьнем гэтых пляноў усімі ўстановамі і арганізацыямі; мабілізацыя пралетарскай грамадзкасьці і шырокіх колаў працоўных мас на актыўны ўдзел ва ўсіх вучастках культурнага будаўніцтва.

Наркамасьветы даручана ў дэкадны тэрмін скласьці праект палажэньня аб саветах культурнага будаўніцтва.

Рыбапрадукты—рабочым цэнтрам

Полацкі вучастак

абавязан даць Менску і Віцебску 13.200 цэнтнэраў рыбы

Сёнешнія тэмпы работы пагражаюць зрывам гэтага важнейшага заданьня

Неадкладна пераключыцца на баявыя рэйкі. Давесьці плян пову да кожнай арцелі, кожнага рыбака

ПРАРЫЎ ЗА ПРАРЫВАМ

Полацкі рыбвучастак павінен даць для забесьпячэньня асноўных рабочых цэнтраў—Менск, Віцебск—**13.200 цнт. рыбы.** Важнасьці выкананьня пляну лоўлі ў гэтым рыбным вучастку даказваць ня прыходзіцца. Адтак, гэты вучастак ужо мае сур'ёзны прарыў: **на 1 красавіка гадавы плян выкананы усяго... на 13,5 проц.** Дырэктыва студзеньскага пленуму ЦК КП(б)В аб улове ў першым квартале ня менш 35-40 проц. гадавога пляну **ня выкананa.**

Работнікі полацкага рыбнага вучастку фактычна ігнаравалі пастанову ЦК, не давялі яе да кожнай арцелі. Асноўная маса рыбакоў нават незнаёма з гэтай важнай пастановай. Растлумачальная работа сярод арцеляй аб важнасьці выкананьня пляну ўлову ня была праведзена.

Разьмеркаваньне пляну ўлову паміж паасобнымі арцелямі і калгаснымі брыгадамі было праведзена **механічна.** Колькасьць рыбакоў у кожнай арцелі, колькасьць і асьбліўасьці ўгодкаў лоўлі і вадазароту ня ўлічваліся. У зімовым Лясьнянскай арцелі, якая налічвае 77 членаў, атрымала такі-ж плян улову, як і Нішчадрынская, якая налічвае ўсяго 50 членаў.

Характэрна, што для арцеляй з аднаасобнікаў сярэдні гадавы ўлоў на кожнага рыбака складае 18-28 цнт., а на калгасную брыгаду — 45-50 цэнтнэраў.

Такое «разьмеркаваньне» пляну лоўлі дае поўную магчымасьць арцелям з аднаасобнікаў выходзіць на лоўлю толькі 12-15 дзён у месяц, замест 20-25 дзён. І сапраўды, сярэдні выхад на лоўлю ў радзе арцеляй аднаасобнікаў—10-12 дзён. Ёсьць факты, калі арцелі (**Гомельская** і інш.) выходзяць на лоўлю толькі ў сонечныя дні, гадзін у 12 дня, наловіць рыбы для сябе і гэтым задавальняюцца. Калі ў **Гомельскай і Бярозаўскай арцелях** (Полацкі рыбвучастак) пачаліся нівады, дык іх ладзілі... каля паўтара месяца. Аб тым, якая «ўвага» аддавалася работнікамі рыбвучастку і арцелямі выкананьню бацькоўга заданьня партыі, сьведчыць тое, што да гэтага часу ня толькі члены арцеляй, але нават старшыні і інструктары вучастку ня ведаюць, як выконае свае заданьне тая ці іншая арцель. Інструктар рыбвучастку **Скавырка** бязьдзейнічае, не рэагуе на недапушчальную маруднасьць у падладжаньні невадаў, ні разу ня ставіў пытаньня аб працы арцеляй у сельсаветах, райвыканкомах і г. д.

Ударніцтва і сацэўаборніцтва ў арцелях праводзіцца фармальна, у дагаворах сацэўаборніцтва штампуюцца агульныя пункты. Праверка выкананьня дагавораў не праводзіцца ні арцелямі, ні вучасткамі. Да гэтага часу арцелі засьмечаны чужымі элементамі, якія пралезьлі туды для таго, каб карыстацца адведзенымі ільготамі, атрымаць спецвопратку і г. д. У Лясьнянскай і Нішчадрынскай арцелях выяўлена такіх 15 чал.

Прэміраваньня лепшых рыбакоў-ударнікаў ня было. Наадварот, ёсьць выпадкі няправільнага прэміраваньня арцеляй. Так, Гомельская арцель, якая выканала плян першага кварталу ўсяго на 25 проц., чамусьці атрымала прэмію. За першы квартал лоўлі па вучастках ахоплена толькі 25 проц. вадаёмаў. Ні дзіва, што плян улову першага кварталу гэтага году выкананы на 25 проц. менш пляну першага кварталу 1930 году ў той час, як сетка арцеляй было тады на-палову меншая і ўмовы работы вызначна горшыя.

Некаторыя мясцовыя арганізацыі адносяцца да рыбнай справы вусім недацупчальна. **Гомельскі** сельсавет, дзе арцель існуе ўжо калі году і знаходзіцца пад бокам, ні разу не зацікавіўся работай апошняй. **Ветрынскі** райвыканком прахаладзіў яшчэ адзін факту адмаўленьня праўленьнем **калгасу «Праца»** ад лоўлі рыбы. Апошні катэгарычна заявіў рыбвучастку, што з 15 красавіка (!!) ад лоўлі рыбы адмаўляецца з тае прычыны, што... «у зьвязі калгасу патрэбна будзе шмат рабочых рук для уборкі пасеваў».

Калгас **«Бальшавік»** адмовіўся ад прадастаўленьня купленых за ашуканчаны Белрыбаксаюзам крэдыт коняй для перавозкі рыбы. Праўленьне калгасу **«Прызэр'е** ня прымае мер да сьлёй рыбацкай брыгады, якая за ўвесь перыяд кварталу была на ўлове толькі 20 дзён. **Райкалгассаюз** на ўсе гэтыя факты не рэагуе.

Падрыхтоўка да веснавога ўлову ідзе вельмі марудна і стварае рэальную пагрозу зрыву пляну. У значнай частцы арцеляй нават яшчэ не падрыхтаваны прылады для веснавой лоўлі. Арцелі лічаць, што з моманту пуску лёду да ачысткі ад яго вадазбораў можна будзе адначыць прыкладна 1-1 з пал. месяца. Гэтую думку падтрымліваюць і работнікі рыбвучастку. Замест таго, каб прыняць усе меры да падрыхтоўкі ўсякіх сетак і мярэж з тым, каб ахапіць поўнасьцю берагі рэк і вазёр, рыбвучастак спадзяецца на адзіночкі-прыбярэжнікаў, якіх, да рэчы, да гэтага часу зарэгістраваны усяго... 21 чал. і на вусім пасёлкіх прыбярэжных арцеляй.

Ня гледзячы на ўсю важнасьць выстукі вадазбораў, рыбвучастак да гэтага часу ня мае нават сьпісу вадазбораў, дзе неабходна правесьці агыстку.

Ступень забясьпечанасьці арцеляй лёдам рыбвучасткам ня ўлічваецца. Ёсьць такія арцелі, якія забясьпечаны лёдам амаль на два гады і ёсьць такія, што маюць яго ў вусім вызначнай колькасьці (брыгада калгасу «Туросы», Лясьнянская арцель і інш.).

Кіраўніцтва Полацкім вучасткам з боку **Белрыбы** вусім непісьтарчальнае. Плян рыбзаготаўленьня ні з кім ня ўгоджан; ні загадчык рыбвучасткам, ні арцель, ні мясцовыя арганізацыі ня ведаюць, дзе, у якіх вадазборах і колькі будзе пасаджана малькоў каштоўных парод.

Пастанова СНК БССР ад 6 лютага катэгарычна забаранае выдаў сёлу і рацыпуцкі. Як-жа выконваецца гэта пастанова? Замест таго, каб вынаймець (па ўгодненасьці з асноўнай масай вопытных спецыялістаў-рыбакоў) месцы рыбазасяленьня і **зрабіць іх запаведнікамі,** Белрыба намічае і на гэты год пасадзіць гэтых малькоў у большасьці водаёр Полаччыны. Гэта фактычна выклікае спыненьне лоўлі ў большасьці прадукцыйных вадазборах.

У існуючую ў Ветрынскім раёне **Наўпіцкую прудавую гаспадарку** ўкладзена шмат дасяткаў тысяч рублёў і да гэтага часу гаспадарка не дала зімовага кілі таварнага карпа. Апошні сыстематычна яне там. Пасадка карпа ў гэтай гаспадарцы ўчоцень праводзіцца бестаспадарча. У сажалку, плошчай у 1.250 кв. м. пасаджана малька-сеяга 18.347 штук, а ў зімавальнік, плошчай у 2.755 кв. мэтраў, пасаджана ўсяго 11.621 шт. Гэта было зроблена на пасадзьні рыбгасаў Белрыбы. Апошняя мерзкай частку рыбы перавезьці ў Сталінскую рыбную гаспадарку. Але марудныя тэмпы работы гэтых рыбгасаў даюць да таго, што бочкі для перавозкі рыбы прыйшлі толькі ў лютым месяцы, калі ўжо сажалкі былі падрыты лёдам.

Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што **сыстэма самацёку ў рабоце Белрыбы і Белрыбаксаюзу,** якія адказваюць перад рабочай клясай за выкананьне пляну лоўлі,—**у поўным росквіце.**

Парамэтаў пляцон рашуча ударыць на самацёку ў рабоце Белрыбы і Белрыбаксаюзу, прыкладзь аднаго апошніх павінцца такім да сьмяротнасьці. Трэба дабіцца, каб рыбацкія арцелі перагарнуліся ва ўсякрэна рыбацкія калгасы, якія сумесна з рабочай клясай выкананьне за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады.

Брыгада Наркамснябу БССР—ЛЕВІН, З., ЯЕФОЎ.

Кулаку ня спыніць калгаснага руху

Заслухаўшы паведамленьне аб таварыстычным акце над калгасьнікамі т. т. ШАЙКО С. І ШАЙКО К. КАЛГАСУ «ПЕРАМОГА», Карапішчанскага сельсавету, з боку кулацкага агента КАСЬЦЯЛЕЦКАГА КАЗІМІРА і кулака КАСЬЦЯЛЕЦКАГА КАЙТАНА,—першы батрацка-бядняцкі зьлёт Менскага раёну заяўляе: КУЛАКУ НЯ СПЫНІЦЬ КАЛГАСНАГА РУХУ. НАС ТЭРОРАМ НЕ ЗАПАЛОХАЕШ.

У адказ на тэрор першы зьлёт батрацка-бядняцкіх груп абвяшчае слабе ударным па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы і арганізацыі калгаснага прыліву.

МЫ ЗЬВЯРТАЕМСЯ ДА ЎСІХ КАЛГАСЬНІКАЎ, БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ АДНААСОБНІКАЎ У АДКАЗ НА КУЛАЦКІ ТЭРОР ПА-БАЛЬШАВІЦКУ ПРАВЕСЬЦІ ВЕСНАВУЮ СЯЎБУ. МЫ ПАТРАБУЕМ АД ПРАЛЕТАРСКАГА СУДА, ДА КУЛАЦКАГА АГЕНТА КАСЬЦЯЛЕЦКАГА К. І КУЛАКА КАСЬЦЯЛЕЦКАГА КАЙТАНА ВЫШЭЙШАЙ МЕРЫ САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЫ—РАССТРЭЛУ.

Бюракраты тармозяць пабудову Ільназаводаў

Наркамзем СССР пастанавіў у 1931 годзе пабудаваць каля 450 заводаў па першапачатковай апрацоўцы ільну. З гэтай колькасьці **46 заводаў павінны быць пабудаваны ў БССР.** Значэньне гэтых заводаў вялізарнае. Заводы дадуць магчымасьць значна павялічыць пасеў ільну, бо да гэтага часу галоўным тормазам у папшырэньні плошчы пад ільном быў недахват рабочых рук, якіх асабліва цяпер цяжка знайсьці для апрацоўкі ільну. Па даных нашага друку, у гэтым годзе ляжыць на 100 мільёнаў рублёў неапрацаванага ільну, тым часам, калі ільнапрадзільныя фабрыкі адчуваюць недахват сырцу.

Ня гледзячы на тое, што да пачатку будаўнічага году засталіся лічаныя дні і трэба неадкладна фарсаваць вывазку лесаматэрыялаў, апараты райвыканкомаў марудзяць. Райвыканкомы адмаўляюцца даручыць сваім апаратам рабіць патрэбныя дасьледчыя работы (Сіроцін). Больш за ўсіх вызначаецца полацкі райвыканком, старшыня якога катэгарычна адмовіўся прадаставіць 1-2 пакоі для раённай канторы будаўніцтва групы заводаў, матывуючы тым, што ў полацкім раёне завод не будуецца. На паказаньне, што ёсьць пастанова ЭКАНА БССР (ад 18-га лютага 1931 году і дадатак да яе) аб неабходнасьці прадаставіць памяшканьні для кантор і людзей, старшыня райвыканкому адказвае: «Ім наверсе лёгка пісаць, а мы выканаць ня можам і для нас гэтае абавязкова». Раённы камітэт партыі нават і слухаць ня хоча аб дапамозе.

Начальнік будаўніцтва групы заводаў Полацкага раёну

РОЗЕНБЛЮМ.

РАСОНСКІ РАЕН ПЕРШЫ

выканаў плян адгрузкі бульбы

Іншыя раёны зрываюць вывазку

Ня гледзячы на катэгарычнае распараджэньне Наркамснабу — фарсаваць загатоўку і адгрузку бульбы, да гэтага ніякага зруху ў бульбазагатоўках няма. Белкаапсаюз і Белільнасаюз ня прынялі ніякіх мер, каб арганізаваць загатоўкі бульбы, каб выканаць цэнтралізаваны плян вывазу. З 61 тоны, якія трэба вывезьці ў Ленінград і Маскву, адгружана толькі 200 тон.

Досыць адзначыць, што амаль ні адзін раён не разгарнуў работы па адгрузцы бульбы Ленінграду і Маскве.

Раёны спадзяюцца, што шляхам замаруджваньня выкананьня заданьня, яны змогуць унікнуць вывазу. Трэбе іх катэгарычна папярэдзіць, што ніякіх паспабленьняў у выкананьні пляну загатовак ня будзе. Арганізацыі, якія зрываюць пляны загатовак і адгрузкі бульбы ў пралетарскія цэнтры, будуць адказваць перад пралетарскай грамадзкасьцю.

Расонскі раён, які мабілізаваў усе сілы для выканаьня заданьня, арганізаваў хуткую адгрузку бульбы да чыгункі і ў два дні цалкам выканаў нараду на вываз бульбы ў Ленінград. Гэтым ён паказаў сапраўды ўдарныя тэмпы.

Усе раёны павінны пасьледваць прыкладу Расон і цалкам выканаць заданьне на вываз.

Нельга адцягваць вывазку, трэба шырока скарыстаць спрыяючае надвор'е.

Камісія ЦКК-РСІ па чыстцы Дзяржпляну абвяшчае:

1. 12 красавіка ў 6½ гадз. вечара ў клюбе гарсавету пачынаецца чыстка сельска-гаспадарчай статыстычнай сэкцыі Дзяржпляну. Чыстку будуць праходзіць 8 асоб—Кубан, Пэўзнэр, Быкова, Ліўшыц, Разэнблюм, Крупскі, Лебедзева і Адамовіч. Яны абвінавачваюцца ў садзейнасьці шкодніцкім у зрыве сельска-гаспадарчай статыстыкі, уліку пасеўных плошчаў, ураджайнасьці і г. д. Большасьць асоб, якія будуць праходзіць чыстку, па сваім сацыяльным паходжаньні з памешчыкаў, афіцэраў і гандляроў.

ЦКК-РСІ абавязвае ўсіх працаўнікоў плянавых і статыстычных частак савецка - каапэрацыйных і асабліва зямельных органаў зьявіцца на сходы па чыстцы с.-г. статыстычнай сэкцыі Дзяржпляну.

2. 11-га красавіка, у 7 гадз. вечара ў пенкутну Дзяржпляну (пляц Волі) адбудзецца чыстка транспартнай сэкцыі Дзяржпляну. Чыстку будуць праходзіць Руткоўскі і Кірнеўіч. Яны абвінавачваюцца ў зрыве раду мерапрыемстваў па сацыялістычнай рэканструкцыі транспарту, у бюракратычным ігнараваньні працэсу працаўнікоў і ў двы дні цалкам выканаў нарады на вываз бульбы ў Ленінград. Гэтым ён паказаў сапраўды ўдарныя тэмпы.

Усе раёны павінны пасьледваць прыкладу Расон і цалкам выканаць заданьне на вываз.

Нельга адцягваць вывазку, трэба шырока скарыстаць спрыяючае надвор'е.

Не дапушчаць ігнараваньня аднаасобных бядняцка-сераднякіх мас

У Шклоўскім раёне ёсьць поўныя тэндэнцыі з боку асобных парт'ячэек адмовіцца ад работы з беднатой. Апартуністычныя элементы, якія і раней недаацэньвалі важнасьці гэтай работы, зараз адкрыта прабуюць тлумачыць пастанову VI Усесаюзнага зьезду саветаў, у сказоным выглядзе, як «зьмену палітыкі» ў адносінах да беднаты. Яны зьмены знаходзяць у тым, што нібы зараз беднота і серадняцкая частка сялянства, якая яшчэ не ўвайшла ў калгасы, зьяўляецца такой масай, з якою ня варта лічыцца. Таму замест сыстэматычнай настойлівай работы ўжываецца адміністраваньне.

Зразумела, што такія адносіны да бядняцкіх і сераднякіх аднаасобных мас дапамагаюць клясаваму ворагу ўмацоўваць яго пазыцыі ў змаганьні супроць калгаснага будаўніцтва.

У **Зарэчна-Шклоўскім** сельсавеце ўвесь час злачынна ігнаруецца работа з беднатой, што прыводзіць да зрыву раду важнейшых гаспадарчых мерапрыемстваў партыі і ўраду. Кулацтва і заможнікі, карыстаючыся бязьдзейнасьцю партыйнай ячэйкі і сельсавету, групуюць вакол сябе паасобныя групы беднаты і серадняку.

Старшыня сельсавету Міранкоў лічыць, што на тэрыторыі яго сельсавету няма «беднякоў і сераднякоў і кулакоў, а ёсьць толькі мяшчане». Выходзячы з гэтай апартуністычнай установы, сельсавет ня бачыць кулацка-заможных гаспадарак, вельмі часта адкрыта абаранае кулакоў і робіць перагібы ў адносінах да сераднякоў, даводзячы цьвёрдае заданьне да маламоцных сераднякіх гаспадарак.

Шклоўская партарганізацыя пачала рашуча ўдарыць па ўсякіх спробах апартуністычных элементаў скажаць выразныя дырэктывы партыі і ўраду ў пытаньнях калгаснага будаўніцтва, прыцягваючы да суровай адказнасьці апартуністаў, якія ігнаруюць работу сярод бядняцкіх і сераднякіх мас вёскі, якія дапушчаючы антысераднякіцкія перагібы, узмацняюць пазыцыі клясавага ворага.

Н.

Паведамленьні

— Менгарком КП(б)Б і фракцыя праўленьня ЖАКТ'у № 7 склікаюць сёньня, 11 красавіка агульны сход камуністаў, якія пражываюць у дамох ЖАКТ'у № 7, у 7 гадз. веч., у памяшканьні ЖАКТ'у. Яўка абавязкова ў парадку партыйнай дысцыпліны.

— Мен. ГарКК РСІ сумесна з ЦСПСБ 11-га красавіка ў 7 гадз. вечара (у залі пасяджэньняў ЦСПСБ, пакой № 10), склікае нараду пэфствуючых прадпрыемстваў пад апаратам і прыгарадныя гаспадаркамі МІРК.

На нараду павінны зьявіцца прадстаўнікі: заўкомаў, старшыні каапбюро і сац.-бытавых сэктараў наступных фабрык і заводаў:

1) з-д «Камунар», 2) абутковая ф-ка, 3) з-д імя Варашылава, 4) завод Ударнік, 5) Эльвод, 6) завод «Бальшавік», 7) фабрыка «Кастрычнік», 8) друкарня імя Сталіна, 9) Чыгунка, 10) завод «Дрэваапрацоўшчык», 11) шклозавод «Пралетары». Персанальна выклікаюцца т. т. Матусевіч — ЦКК - РСІ, Беленькі, Давідовіч — ЦСПСБ, Вішнеўская, Карначоў—Гарком КП(б)Б, Тарасэвіч, Фаламеткаў, Лавор, Турэцкі, Школьнікаў—МІРК, Плешакоў—ЦСПСБ Шулькін — Арг. тройка Менгаррпрафсавету, прадст